5 05

Гісторыя і культура Беларусі

Выданне ЦК КП(б)Б

МАРЫЯ ІЛЬІНІЧНА УЛЬЯНАВА

Сястра Владзіміра Ільіча

12 чэрвеня памерла ад крывазліцця ў мозг Марыя Ільінічна Ульянава—59 год ад роду. Усё яе жыццё было непарыўна звязана з жыццём і работай Ільіча. Расла Марыя Ільінічна ў Сімбірску (цяпер Ульянаўск), бацька яе быў шасцідзесятнікам, нястомна працаваўшым на фронце асветы. Сям'я была вельмі культурнай і жыла інтарэсамі перадавой інтэлігенцыі таго часу. Увесь тон хатняга жыцця выхоўваў. Браты і сёстры былі вельмі дружнымі. Ільіч з ранняга дзяцінства асабліва цёпла і клапатліва адносіўся да малодшых—сястры Марыі Ільінічны і брату Дзімітрыю Ільічу, карыстаўся сярод іх велізарнейшым аўтарытэтам. Дзевяцігадовай дзяўчынкай бачыла М. І., як маці, старшая сястра Анна, Ільіч, сястра Ольга перажывалі кару смерцю старшага брата, Аляксандра Ільіча (8 мая 1887 г.). Яна на ўсё жыццё запомніла словы Ільіча, сказаныя ім, калі прышла вестка аб пагібелі старшага брата, палка шукаўшага шляхоў перабудовы ўсяго грамадскага ўклада, у той час, калі толькі яшчэ пачынаў зараджацца ў Расіі рабочы рух. Аляксандр Ільіч ішоў яшчэ па старому шляху—шляху барацьбы адзіночак з бязмежным праізволам і прыгнечаннем. „Другім шляхам трэба ісці“,—сказаў Ільіч, і М. І. пайшла па другому, ленінскаму шляху.

Ільіч быў арыштаван у Пецербурзе ў 1895 г., калі Марыі Ільінічне было 17 год. Яна прыехала разам з маці і старшай сястрой у Піцер, хадзіла да брата на спатканні, была ў курсе распачаўшагася шырока разгортваюча рабочага руху ў 1896 годзе. Ад старшай сястры, ад Ільіча вучылася яна тагочаснай падпольнай канспірацыі. У 1899 г. у Маскве М. І. арыштоўваецца і высылаецца ў Ніжні. Звярнуўшыся ў Маскву, яна яшчэ мацней узялася за работу. У пачатку сакавіка 1901 г. была адначасова з мужам старшай сястры, Маркам Цімафеевічам Елізаравым, арыштавана па справе маскоўскай арганізацыі партыі, сядзела ў турме і выслана ў Самару.

За граніцай сіламі Ільіча была ў той час арганізавана нелегальная агульна-руская соцыял-дэмакратычная газета „Искра“. „Из искры возгорится пламя“—такі лозунг „Іскры“. Полымя гэта разгарэлася ў рэволюцыйны пажар. Разгарэлася таму, што была ў Расіі моцная арганізацыя, вялася нястомная праца па ўмацаванню сувязей, арганізацыі людзей. Усё пашыралася прапаганда і агітацыя сярод мас.

У Самары М. І. працавала ў групе так званых агентаў „Искры“, разам з Кржыжаноўскім, Ленгнікам, Красікавым і іншымі таварышамі, якія падрыхтоўвалі II з'езд партыі. Калі ў1903 годзе адбыўся раскол на II з'ездзе, М. І. адразу-ж стала на бок большэвікоў. Праца разгортвалася ў шырыню. Набліжаўся 1905 г. У студзені 1904 г. М. І. была арыштавана ў Кіеве разам з Дзімітрыем Ільічом, яго жонкай і сястрой Аннай Ільінічнай, Зінаідай Паўлаўнай Кржыжаноўскай, Р. Образцовай і інш. Выпусцілі М. І. у чэрвені 1904 г. Слежка за ёй была ўстаноўлена адчайная, працаваць стала немагчыма, і яна ў канцы 1904 г. прыязджае ў Жэневу, дзе ў той час жыў Ільіч, і акунаецца ў вострую атмасферу эмігранцкага жыцця таго часу. У 1905 г. звярачваецца ў Піцер і вядзе вялікую работу сярод рабочых. У 1907 г., калі насунулася рэакцыя і стаў звужацца размах працы, М. І. пад кіраўніцтвам Ільіча бярэцца за пераклад „Писем Маркса к Кугельману“ і „Писем к Зорге“.

Марыя Ільінічна востра перажывала барацьбу, якую праводзіў Ільіч з адзавістамі, прымірэнцамі, дапамагала яму ў працы. У 1910 г. М. І. пасяляецца ў Саратаве, дзе ў 1911 г. арыштоўваецца па справе саратаўскай арганізацыі і высылаецца ў Валагодскую губерню на тры гады. Там працуе сярод чыгуначнікаў, збірае грошы, усяляк дапамагае ўмацаванню большэвіцкай партыі. М. І. заўсёды абкружала Ільіча асаблівымі клопатамі: клапацілася аб яго вопратцы, харчаванні, зручнасці, аб тым, каб яму не прыходзілася думаць пра дробязі быта.

З сакавіка 1917 г. да вясны 1929 г. М. І. працуе ў „Правде“, як сакратар, а потым як член рэдкалегіі. Першыя гады яе праца праходзіць пад кіраўніцтвам Ільіча. Яе вопыт шырокай работы з масамі, ленінская прывычка прыслухоўвацца да голаса мас зрабілі яе актыўным арганізатарам рабкораўскага руху.

Марыю Ільінічну ведалі многія, але і яна ведала масу людзей, помніла рабочых, сярод якіх калісьці вяла работу, помніла рабкораў.

Цяжка перажывала М. І. замах на Ільіча, яго цяжкую хваробу і смерць. Ільіча яна горача любіла і ён таксама горача любіў яе. 8 сакавіка 1933 г. яна была узнагароджана ордэнам Леніна. На XIV з'ездзе партыі яна выбіраецца членам ЦКК, потым уваходзіць у прэзідыум ЦКК, вядзе барацьбу са скажэннямі лініі партыі, удумваецца ва ўсе дробязі. З XVII з'езда партыі—членКамісіі СовецкагаКантролю, член Бюро Камісіі Совецкага Кантролю, загадчык Бюро скарг. На гэтай працы яна неяк асабліва развярнулася, змагаючыся з усіх сіл за лінію партыі, настойліва і ўмела дабіваючыся ліквідацыі ўсякіх памылак, скажэнняў, якія перашкаджаюць наладжванню совецкай работы. Работа гэта яе задавальняла, гэта была жывая дапамога соцыялістычнаму будаўніцтву. Сіл сваіх яна не шкадавала, працавала з ранку да 3—4 гадзін уначы, без адпачынку, без перапынку. Ужо хворая прымала актыўны ўдзел у работах раённай Маскоўскай гарадской і абласной канферэнцый. Прышоўшы на работу канферэнцыі, яна адчула маганне з'ягла і ўжо

Марыя Ільінічна любоўю заўсё... таварыша... ўсю я...

Друк. 2-а Гасоўніка № 2185
Папер. 120×140 друк. знакаў

НА ВОКЛАДЦЫ: Дэлегат XVI з'езда КП(б)Б ЕФРАСІННЯ Менскай швейнай фабрыкі імя Крупскай.

XVI З'ЕЗД КП(б)Б

19 чэрвеня закончыў сваю работу XVI з'езд КП(б)Б. Гэты з'езд увойдзе ў гісторыю КП(б)Б, як з'езд баявой большэвіцкай загартаванасці, небывалага згуртавання вакол ЦК ВКП(б), вакол таварыша Сталіна. Гэты з'езд „увойдзе ў гісторыю КП(б)Б, як з'езд умацавання мабілізаванасці і далейшай большэвізацыі нашых радоў, як з'езд ачысткі радоў КП(б)Б ад двурушнікаў, трацкістаў, правых, нацыяналістаў і ўсякіх другіх агентаў германскага, японскага і польскага фашызма". (Шаранговіч).

XVI з'езд КП(б)Б падвёў вынікі той гераічнай работы і барацьбы, праведзенай рабочым класам і калгасным сялянствам, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, ЦК ВКП(б) і вялікага Сталіна за тры з паловаю гады—перыяд часу, аддзяляючы нас ад XV з'езда КП(б)Б.

Кожны з нас памятае, што з сябе прадстаўляла Беларусь у недалёкім мінулым; толькі якіх-небудзь дваццаць год таму назад. Гэта была акраіна царскай імперыі, якая знаходзілася пад уціскам царскіх сатрапаў і чыноўнікаў, памешчыкаў і капіталістаў. Беларускі народ цярпеў падвойны ўціск—нацыянальны і соцыяльны. Толькі Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя 1917 года, знішчыўшая клас капіталістаў і памешчыкаў, устанавіўшая дыктатуру пролетарыята на адной шостай частцы свету, вызваліла і беларускі народ. Толькі з дня Вялікага Кастрычніка Беларусь вядзе летазлічэнне сваёй дзяржаўнасці, стваральнікам якой, як і стваральнікам КП(б)Б, з'яўляецца таварыш Сталін. Толькі з Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыяй звязана стварэнне Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. У цесным саюзе з народамі вялікага Совецкага Саюза, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і вялікага Сталіна, паспяхова ажыццяўляючы ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, БССР дасягнула выключна вялікіх поспехаў на фронце соцыялістычнага будаўніцтва.

Беларусь з краіны жабрацтва і голаду ў мінулым ператварылася ў квітнеючую соцыялістычную рэспубліку з высока развітай соцыялістычнай прамысловасцю і соцыялістычным земляробствам.

Ліквідаваўшы ў рэзультаце Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі капіталістаў і памешчыкаў, Беларуская ССР, на аснове сталінскіх пяцігодак, пабудавала магутную індустрыю. Дробныя сялянскія гаспадаркі ператвораны ў буйныя соцыялістычныя гаспадаркі, аснашчоныя высокай тэхнікай. На базе суцэльнай калектывізацыі ліквідаваны апошні капіталістычны клас—кулацтва.

Велізарныя поспехі дасягнуты і ў галіне культурнага будаўніцтва. Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка забяспечыла грандыёзныя поспехі не толькі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, але і ў соцыялістычнай беларускай культуры. Дзесяткі вышэйшых, сотні сярэдніх навучальных устаноў, навукова-даследчых інстытутаў, тэатры, клубы, кіно, хаты-чытальні, рост навукі і друку—усё гэта ёсць рэзультат паслядоўнага ажыццяўлення генеральнай лініі нашай партыі і ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Усе гэтыя дасягненні, якія маюць сусветна-гістарычнае значэнне, запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі. Аб усіх гэтых дасягненнях гаварыў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч у сваім справаздачным дакладзе на XVI з'ездзе КП(б)Б. Аб гэтых дасягненнях гаварылі таксама і дэлегаты з'езда.

Але нашы дасягненні, дасягненні соцыялізма былі-б яшчэ большымі, калі-б шкоднікі і дывер-санты, агенты фашысцкіх ахранак, не шкодзілі нам. У справаздачным дакладзе ЦК КП(б)Б былі ярка ўскрыты факты, паказваючыя, як у радзе партыйных арганізацый, у рэзультаце самасупакоенасці, страты большэвіцкай пільнасці, адсутнасці большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі і дастатковай сувязі з масамі праглядзелі ворагаў народу, пранікшых не толькі на гаспадарчую і совецкую работу, але і ў партыйны апарат.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б), ажыццяўляючы мудрыя ўказанні таварыша Сталіна, разграміла нацдэмаў, трацкістаў, правых—гэтых агентаў япона-германскай і польскай разведак. Такія заядлыя ворагі народу, як Ігнатоўскі, Баліцкі, Прышчэпаў і інш. былі выкрыты і выгнаны з радоў КП(б)Б. Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі ў гэтай барацьбе паказала сябе, як верны атрад ВКП(б), для якога паслядоўнае ажыццяўленне інтарэсаў рабочага класа вышэй за ўсё.

Аднак пасля выкрыцця гэтых ворагаў, партыйныя арганізацыі супакоіліся, забыўшы аб тым, што СССР знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні.

Узброеная гістарычнымі рашэннямі лютаўскага пленума ЦК ВКП(б), дакладам і заключным словам таварыша Сталіна, КП(б)Б на справаздачна-выбарчых сходах, на раённых і гарадскіх партыйных канферэнцыях і асабліва на самым з'ездзе з усёй большэвіцкай рэзкасцю ўскрыла ўсе буйнейшыя прарывы і недахопы, якія ёсць у партыйна-палітычнай рабоце. На аснове шматлікіх фактаў і прыкладаў з'езд паказаў, да чаго прыводзіць захапленне гаспадарчымі поспехамі, забыццё на капіталістычнае акружэнне, у якім мы знаходзімся.

Таварыш Сталін на лютаўскім Пленуме ЦК ВКП(б) у сваім дакладзе гаварыў: „...Капіталістычнае акружэнне гэта не пустая фраза, гэта вельмі рэальная і непрыемная з'ява. Капіталістычнае акружэнне гэта значыць, што ёсць адна краіна, Совецкі Саюз, якая ўстанавіла ў сябе соцыялістычныя парадкі і ёсць апрача таго многа краін—буржуазныя краіны, якія прадаўжаюць весці капіталістычны спосаб жыцця і якія акружаюць Совецкі Саюз, чакаючы выпадку для таго, каб напасці на яго, разбіць яго, або ва ўсякім выпадку—падарваць яго магутнасць і аслабіць яго". Далей таварыш Сталін гаворыць: „...Пакуль існуе капіталістычнае акружэнне, будуць існаваць у нас шкоднікі, шпіёны, дыверсанты, забойцы, засылаемыя ў нашы тылы агентамі замежных дзяржаў".

Для барацьбы з вялікім Совецкім Саюзам ворагі выкарыстоўваюць усе сродкі. Яны пранікаюць на вытворчасць, у совецкі апарат, на культурна-ідэалагічны фронт, яны прабуюць пранікаць і ў партыю, для таго, каб, прыкрываючыся партыйным білетам, маскуючыся, двурушнічаючы, шкодзіць соцыялістычнаму будаўніцтву. Іменна аб гэтым многія кіруючыя таварышы

забылі. Яны не заўважылі той глыбокай розніцы, якая існуе паміж трацкізмам у мінулым і сучасным. Яны да канца не ўсвоілі таго, што сучасны трацкізм з'яўляецца бяспрынцыпнай і безыдэйнай бандай шкоднікаў, дыверсантаў, разведчыкаў, шпіёнаў, забойц, бандай заклятых ворагаў, якія дзейнічаюць па найму і ўказцы фашысцкіх ахранак.

Захапленне гаспадарчымі дасягненнямі, запушчанасць партыйна-палітычнай работы, адсутнасць большэвіцкай пільнасці ў радзе партарганізацый прывяло к таму, што мы своечасова не заўважылі, як гэтыя шкоднікі, дыверсанты, шпіёны, агенты германа-японскіх і польскіх ахранак, прабраўшыся на адказныя пасады, на працягу раду год праводзілі сваю актыўную, контррэволюцыйную работу, накіраваную супроць партыі, супроць вялікага совецкага народу.

Увесь совецкі народ, і ў тым ліку народы Беларусі, даведаўшыся з паведамлення пракуратуры аб гнуснай здрадніцкай рабоце агентаў фашысцкіх ахранак Тухачэўскага, Убарэвіча, Якіра і інш., адзінай волей патрабаваў ад пролетарскага суда змесці гэтых гадаў з твару зямлі. Здраднікі і прадажнікі радзімы атрымалі належнае. Пролетарскі суд імем народу вынес ім смяротны прыгавор, які прыведзен у выкананне. Пралічыліся іх гаспадары—японо-германскія фашысты! Совецкі Саюз моцны як ніколі. Совецкі народ—патрыёт сваёй радзімы, які любіць сваю радзіму, сваю партыю, свайго Вялікага Сталіна і нашчэнт разаб'е ўсіх тых, хто ўздумае перашкаджаць пераможнаму руху наперад да комунізма.

У БССР таксама ў апошні перыяд часу нашымі слаўнымі чэкістамі раскрыта група мацёрых ворагаў народу на чале з Бэнэкам, Дзякавым і інш., якія хацелі ператварыць Беларускую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку ў прыдатак да фашысцкай Польшчы. Яны хацелі вярнуць селяніна ў цэпкія лапы памешчыка і кулака, а рабочага аддаць ва ўладу капітала. Па заданню іншаземных контрразведак гэтыя подлыя двурушнікі, шпіёны, дыверсанты, бандыты ўсяляк шкодзілі нашай гаспадарцы. У сваёй шкодніцкай рабоце яны не прыпыняліся ні перад чым, ні перад дыверсіямі, ні перад тэрарам і т. д. Групаўшчына, правааапартуністычная практыка, якая праводзілася Галадзедам, затрудняла партыі весці барацьбу з ворагамі народа.

Але ворагі народу, агенты фашысцкіх ахранак злоўлены з палічным. Магутная рука пролетарскай дыктатуры расцісне ўшчэнт гэтых подлых гадзюк. Ворагі, падняўшыя свае подлыя рукі супроць вялікага совецкага народу, будуць да канца раздаўлены. Караючы меч пролетарскай дыктатуры з усёй бязлітаснасцю абрушыцца на іх голавы.

Баларускі народ і большэвікі Беларусі, да канца адданыя справе Леніна—Сталіна, аддадуць усе свае сілы для таго, каб выкрыць і дабіць трацкісцка-правых нацыянал-фашысцкіх бандытаў, гэтых агентаў японо-германскай і польскай разведак.

Узброеныя рашэннямі гістарычнага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннямі таварыша Сталіна, зробленымі ім у дакладзе і заключным слове на гэтым Пленуме, большэвікі Беларусі, ўзняўшы большэвіцкую пільнасць, разгарнуўшы сапраўдную большэвіцкую крытыку і самакрытыку, прарабілі вялікую работу па ачышчэнню радоў КП(б)Б ад усякіх лазутчыкаў, шпіёнаў і дыверсантаў, якія ашуканчым шляхам прабраліся ў нашы рады. Ачысціўшыся ад гэтых ворагаў, партыя стала яшчэ больш боездольнай, аўтарытэт партыі ў вачах шырокіх працоўных мас яшчэ больш вырас, умацавалася яшчэ больш сувязь з масамі. Выкрыццё ворагаў народу, праведзенае нашай партыі, перш за ўсё сведчыць аб магутнасці нашай партыі, аб яе высокім аўтарытэце, аб той бязмежнай любові, якой яна карыстаецца сярод шырокіх мас працоўных. Але з таго факта, што мы выкрылі главароў фашысцка-шпіёнскай банды, якія прабраліся на высокія пасады, яшчэ не адзначае, што з ворагам ужо пакончана. Наадварот, перад усёй КП(б)Б стаіць адказная задача—разграміць, выкарчаваць ворага да канца з карэннем, вытруціць яго з усіх нор. З гэтай задачай мы яшчэ далёка не справіліся. І зусім правільна з'езд КП(б)Б у сваёй пастанове паставіў як адну з галоўных задач—выкрыццё і знішчэнне ворагаў да канца.

Ажыццяўленне гэтай задачы магчыма толькі пры ўмове, калі партыйныя і непартыйныя большэвікі авалодаюць большэвізмам. Вось чаму рашэнні XVI з'езда прасякнуты канкрэтнымі мерапрыемствамі, забяспечваючымі ажыццяўленне задачы, пастаўленай таварышам Сталіным аб авалоданні большэвізмам.

Перад партыйнымі арганізацыямі стаіць адказнейшая задача: узняць прапагандысцкую і агітацыйную работу на небывалую вышыню. Партыйныя арганізацыі абавязаны так паставіць сваю работу, каб вучэнне Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна зрабіць здабыткам найшырэйшых мас. Нельга гаварыць аб рэволюцыйнай пільнасці без авалодання большэвізмам. Гэта будзе толькі балбатня аб пільнасці. Нельга гаварыць аб авалоданні большэвізмам без таго, каб вывучэнне гісторыі нашай большэвіцкай партыі не паставіць у цэнтры ўвагі.

Нам, большэвікам Беларусі, трэба асабліва памятаць, што мы працуем непасрэдна на рубяжы з капіталістычным светам. БССР з'яўляецца баявым фарпостам Вялікага Совецкага Саюза на Захадзе. Вось чаму мы павінны да канца ўсвоіць, што такое капіталістычнае акружэнне і несупынна працаваць над умацаваннем абароназдольнасці нашай соцыялістычнай радзімы.

КП(б)Б, паслядоўна ажыццяўляючы гістарычныя ўказанні таварыша Сталіна, будзе яшчэ больш умацоўваць сувязь з шырокімі масамі, яшчэ больш узніме рэволюцыйную пільнасць, будзе працаваць над тым, каб палітычна выхоўваць і выкоўваць большэвіцкія кадры для таго, каб з поспехам ажыццяўляць тыя грандыёзныя гістарычныя задачы, якія стаяць перад намі ў сувязі з прыняццем новай Сталінскай Канстытуцыі.

Большэвікі Беларусі ў асобе свайго з'езда далі клятву Цэнтральнаму Камітэту ВКП(б), таварышу Сталіну ў тым, што яны, працуючы на граніцы з капіталістычным светам, памятаючы аб капіталістычным акружэнні, аддадуць усе свае сілы, усю сваю энергію, а калі патрэбна будзе і жыццё, за справу партыі Леніна—Сталіна, за справу нашай любімай соцыялістычнай радзімы, за справу паспяховай пабудовы комуністычнага грамадства. Клятва, даная XVI з'ездам КП(б)Б, ярка і поўнасцю выражае волю і жаданні ўсяго беларускага народу. Беларускі народ пад кіраўніцтвам КП(б)Б, не адзін раз паказаўшы сваю бязмежную адданасць ЦК ВКП(б) і вялікаму Сталіну, і ў сваёй далейшай рабоце пакажа, што ён будзе да канца самааддана змагацца за ажыццяўленне рашэнняў партыі, за канчатковую перамогу комунізма.

11 чэрвеня адбыўся агульназаводскі мітынг рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў станкабудаўнічага завода ім. Кірава (Менск), прысвечаны суду над бандай шпіёнаў і здраднікаў.
НА ЗДЫМКУ: агульны выгляд мітынгу.

Фота Я. Салавейчыка.

НЯМА ЛІТАСЦІ ЗДРАДНІКАМ!

З выключным задавальненнем я сустрэла справядлівы прыгавор Спецыяльнага Прысуцтва Вярхоўнага Суда СССР, прыгаварыўшага да вышэйшай меры соцыяльнай абароны—расстрэлу здраднікаў нашай радзімы, трацкісцкіх гадаў, агентаў фашызма—Тухачэўскага, Якіра, Убарэвіча, Корка, Эйдэмана, Фельдмана, Прымакова, Путна. Гэтыя ворагі народу жадалі адабраць у нас наша шчаслівае жыццё, аднавіць у нашай краіне капіталістычны лад. Агідная банда здраднікаў рыхтавала ўдар у спіну працоўных.

Прабраўшыся на кіруючыя пасады ў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, гэтыя шпіёны раскрывалі ваенныя сакрэты нашым ворагам. Наймiты фашысцкай разведкі рабілі ўсё для таго, каб у выпадку вайны нанесці паражэнне нашай Чырвонай Арміі.

Але яны пралічыліся! Яны забылі, што наша радзіма моцная, што мы, працоўныя краіны соцыялізма, выхаваны Леніным і Сталіным.

Фашыстам ніколі не звярнуць нашу вялікую радзіму са шляху соцыялізма! Нікто не перашкодзіць нам будаваць шчаслівае заможнае жыццё!

Я разам з усімі працоўнымі горача вітаю прыгавор. Такія-ж меры трэба прымаць да ўсіх здраднікаў і катаў з фашысцкіх разведак. А мы, працоўныя, яшчэ цясней згуртуем свае рады вакол правадыра народаў таварыша Сталіна.

Няхай ведаюць ворагі соцыялістычнай дзяржавы, як ненавідзіць іх працоўны народ Совецкага Саюза!

Віцебск

Рая Слуцкіна—
стаханаўка фабрыкі імя Клары Цэткін—дэлегат XVI З'езда КП(б)Б

СМЕРЦЬ ВОРАГАМ!

З пачуццём глыбокага задавальнення сустрэлі калгаснікі і калгасніцы Бароўскага сельсовета прыгавор Совецкага Суда над подлай зграяй здраднікаў радзімы—Тухачэўскім, Якірам, Убарэвічам, Коркам, Эйдэманам, Фельдманам, Прымаковым, Путным.

Пачуццё глыбокай нянавісці да фашысцкіх наймітаў, разам з гатоўнасцю груддзю абараняць сваю соцыялістычную радзіму, выразілі ў сваёй рэзалюцыі калгаснікі калгаса імя 7 Самарскай дывізіі.

Разам з усім вялікім народам Совецкага Саюза ўсе калгаснікі Бароўскага сельсовета шлюць праклёны тройчы празрэнаму фашысцкаму ахвосцю, кучкі шпіёнаў, якія выдавалі фашыстам ваенныя тайны, рыхтавалі паражэнне СССР у выпадку вайны.

Але ніколі не здзейсняцца подлыя мары фашысцкіх гадаў! Мільёны працоўных, кіруемыя вялікай партыяй Леніна—Сталіна, стаяць на варце заваёў нашай соцыялістычнай радзімы. Лазутчыкі фашызма не схаваюцца ад зоркага вока дыктатуры рабочага класа. Гады будуць знішчаны!

У адказ на подлыя дзеянні фашыстаў калгаснікі абяцаюць быць заўсёды на-чаку, яшчэ вышэй узняць рэволюцыйную пільнасць, працаваць яшчэ лепш над умацаваннем калгаса, над ператварэннем яго ў непрыступную крэпасць абароны.

Менскі раён

Наталья Бачурына
парторг сельсовета

Пасля выбараў

Справаздачна-выбарчыя сходы нашай партыйнай арганізацыі прайшлі з вялікім уздымам. Камуністы, як ніколі, крытыкавалі работу партыйнага камітэта, выключна правільна падкрэслівалі ўсе недахопы работы. Асабліва адзначалі дрэнную сувязь парткома з комуністамі, працуючымі ў цэхах, дрэннае кіраўніцтва палітычнай агітацыяй, партыйнай асветай і г. д.

У нашай партыйнай арганізацыі мелі месца парушэнне статута партыі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі. Пры наяўнасці ў арганізацыі менш 100 комуністаў, у нас існавалі 3 цэхавыя партгрупы з платнымі аслабанёнымі парторгамі, а ўсяго ў партарганізацыі працавалі 5 платных, аслабанёных работнікаў.

Гарком партыі накіраваў на другую работу парторгаў фабрыкі Новікаву і Магідаву, якія не зрабілі справаздачы за сваю работу. Мела месца кааптацыя; так, напрыклад, у склад парткома былі кааптаваны тав. Парфіновіч, Макацэвіч і інш.

Наш партыйны камітэт павінен карэнным чынам перабудаваць сваю работу на аснове рашэнняў лютаўскага пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна. Трэба адзначыць, што не гледзячы на тое, што прайшло ўжо шмат часу, а мы зусім мала зрабілі ў справе перабудовы партыйнай работы.

На нашай фабрыцы і раней існаваў агіткалектыў, але да яго работы не былі прыцягнуты кіраўнікі фабрыкі, напрыклад, дырэктар фабрыкі, старшыня фабкома і інш. Цяпер—увесь наш фабрычны актыў уцягнут у работу агіткалектыва. Кожны з нас, кіруючых работнікаў фабрыкі, прымацован да пэўнага ўчастка. Гэта палепшыла работу агіткалектыва.

Не ўсе комуністы ў нас атрымоўваюць цэнтральныя газеты, не ўсе маюць магчымасць чытаць „Правду". Мы арганізавалі ў цэхах чытку з комуністамі перадавых „Правды" і іншых артыкулаў.

У нашай арганізацыі досыць вялікая колькасць комуністаў малапісьменных, палітычна мала падрыхтаваных. Многія з іх раней не выконвалі ніякіх партыйных даручэнняў. Цяпер я ў гутарцы з кожным комуністам паасобку выяўляю яго здольнасці, зацікаўленасць да той або іншай работы, з тым, каб улічыць гэта пры дачы даручэнняў ўцягнуць у актыўную работу.

т. Астроўская

Вынікі такога правільнага падыходу ўжо далі сябе адчуваць. Работніца тав. Ісьянава раней не выконвала ніякай грамадскай работы. Цяпер, калі з ёй пагутарылі, яна сама ўзялася кіраваць арганізацыяй Чырвонага Крыжа на фабрыцы.

У панчошным цэху працуе член партыі тав. Беленькая. Раней ёй рэдка давалі партыйныя даручэнні, і гэта таму, што партарганізацыя фабрыкі не ведала, што яна здольна зрабіць. Цяпер партком даручыў ёй чытку перадавых „Правды" і іншых артыкулаў з комуністамі свайго цэха. Тав. Беленькая з радасцю ўзялася за гэту справу, заявіўшы, што ёй гэта падабаецца і гэта яна зможа выканаць.

У план работы нашай арганізацыі мы ўключылі рад пытанняў, якімі раней зусім не займаліся: штомесячнае скліканне гаспадарчага актыва фабрыкі, яго палітычную вучобу і інш. Але гэта яшчэ толькі пачатак у перабудове нашай работы.

Трэба адзначыць, што ў перабудове нашай работы нам недастаткова дапамагае гарадскі камітэт партыі. Толькі 27 мая гарком склікаў нараду сакратароў парткомаў па пытанню перабудовы работы партарганізацый на аснове рашэнняў пленума ЦК ВКП(б).

На нашай фабрыцы працуе 1400 жанчын. Усімі відамі вучобы—партвучобай, стаханаўскай, тэхнічнай—ахоплена 800 чалавек. Гэта далёка недастаткова. Перад намі стаяць вялікія задачы ў сэнсе перавыхавання жаночых кадраў, асабліва новых работніц.

Цяпер мы рыхтуемся да справаздачна-перавыбарчай кампаніі фабкома. У парадку падрыхтоўкі да гэтага важнейшага мерапрыемства мы сіламі партыйнай арганізацыі і профактыва правялі ва ўсіх цэхах, зменах і на асобных участках гутаркі з работніцамі аб рашэннях VI пленума ВЦСПС і аб парадку закрытага тайнага галасавання пры выбарах. Правялі агульнафабрычны рабочы сход па гэтаму пытанню. У дні справаздачна-выбарчых сходаў, у мэтах лепшага забеспячэння яўкі работніц на гэтыя сходы, мы арганізоўваем дзіцячы пакой.

Па раду прычын, звязаных са шкодніцтвам у лёгкай прамысловасці, мы на працягу двух кварталаў не выконвалі плана. Востра адчуваўся разрыў паміж матальным і трыкатажным цэхамі, недахоп сыравіны і г. д. У другой палове года мы павінны будзем аддаць запазычанасць краіне па недавыкананню плана.

Я і стаханаўка панчошнага цэха тав. Слуцкіна абраны дэлегатамі на XVI партыйны з'езд КП(б)Б. Перад намі, як дэлегатамі з'езда, цяпер стаяць выключныя задачы па перабудове партыйнай работы згодна рашэнняў пленума ЦК ВКП(б). Нашай бліжэйшай задачай з'яўляецца дапамога ў перабудове работы комсамольскай арганізацыі, наладжванне работы фабрычнага друку, ахоп вучобай усіх работніц.

Астроўская—сакратар парткома фабрыкі імя Клары Цэткін

Віцебск

Пачатак работы па-новаму

Наша партыйная арганізацыя малалікая. У яе ўваходзяць 13 членаў і 5 кандыдатаў партыі. Але нам былі ўласцівы ўсе недахопы, аб якіх так ясна гаворыцца ў рашэннях гістарычнага Лютаўскага пленума ЦК ВКП(б), дакладзе і заключным слове таварыша Сталіна.

У арганізацыі груба парушаўся партыйны статут. З студзеня 1934 года партыйны камітэт ні разу не зрабіў справаздачы. За гэты перыяд змянілася 9 сакратароў парткома. У нас была прытуплена большэвіцкая пільнасць, адсутнічала крытыка і самакрытыка, у выніку чаго ў арганізацыю прабраліся варожыя людзі.

У часе абмена партдакументаў у сакратара парткома Пікуса затрымалі партыйны білет за сувязь з трацкістамі. Тры месяцы пасля гэтага ён заставаўся сакратаром парткома.

Пасля справаздачна-выбарчага сходу прайшло два месяцы. На гэтым сходзе поўным голасам загаварылі комуністы аб усіх нашых недахопах. Партком моцна крытыкавалі за прытупленне рэволюцыйнай пільнасці, за дрэнную пастаноўку палітмасавай работы, за дрэнна наладжаную партвучобу. На сходзе па справаздачы парткома выказалася ў спрэчках 16 чалавек з 18 прысутных. Вельмі ўважліва абмяркоўвалі кандыдатуры ў новы склад парткома. Два члены парткома з пяці абраны ўпершыню.

Як-жа мы выконваем рашэнні справаздачна-выбарчага сходу? На красавік і май мы склалі план работы, які абгаварылі і зацвердзілі на агульным партсходзе. У аснову ўсёй сваёй работы мы паставілі выкананне рашэнняў пленума ЦК ВКП(б) і ўказанні таварыша Сталіна аб аўладанні большэвізмам. На трох занятках у гуртку па гісторыі партыі мы глыбока вывучылі даклад і заключнае слова таварыша Сталіна. Арганізавалі таксама і вывучэнне даклада з беспартыйнымі рабочымі і комсамольцамі.

Значна палепшылася ў нас справа з партыйнай вучобай. Усе члены і кандыдаты партыі вывучаюць гісторыю партыі. Акрамя асноўнага падручніка Кнорына, таварышы падрыхтоўваюцца да заняткаў па творах Леніна і Сталіна. Часта арганізоўваем калектыўную чытку некаторых твораў Леніна і Сталіна. На партыйным сходзе 17 мая мы заслухалі справаздачу прапагандыста т. Кахута.

Хачу некалькі спыніцца і на росце людзей у нашай арганізацыі за апошні час. Вось тав. Шэрман. Яна старая работніца, член партыі з 1929 г. Раней яе не прымячалі і нават недалюблівалі за тое, што яна прабавала крытыкаваць начальства. Сакратар парткома Пікус ставіў пытанне аб тым, каб не выдалі Шэрман новага партбілета за тое, што яна выступіла з абвінавачваннем трохкутніка ў зрыве стаханаўскай дэкады. Партыйная арганізацыя інакш адносілася да тав. Шэрман. Аб гэтым сведчыць той факт, што тайным галасаваннем яна была абрана ў партком. Нядаўна мы яе вылучылі начальнікам цэха. Райком зацвердзіў тав. Шэрман намеснікам сакратара парткома.

Не мала гаварылі ў нас аб адсталасці тав. Місевіч. У апошні час яна таксама значна выросла: лепшая стаханаўка на вытворчасці, добрасумленна адносіцца да заняткаў, акуратна выконвае партдаручэнні.

Не гледзячы на тое, што і на нашым сходзе, і на партканферэнцыі многа гаварылася аб недастатковай увазе малым партарганізацыям з боку райкома і гаркома—гэта справа яшчэ не палепшылася. Кагановіцкі райком партыі па-ранейшаму дрэнна кіруе нашай арганізацыяй і мала дапамагае ў рабоце. Пяць месяцаў я працую сакратаром парткома. За гэты час ніхто не прышоў да нас з райкома ў часе заняткаў і не праверыў, як мы вывучаем гісторыю партыі. Інструктар райкома тав. Залеская ні разу не дапамагла мне скласці план работы. Яна аднойчы прышла, паглядзела на план работы і сказала: „Сухі ў цябе, Пятроўская, план". А як лепш яго скласці—не параіла.

Мы яшчэ зрабілі толькі пачатак перабудовы партыйнай работы, выходзячы з рашэнняў пленума ЦК ВКП(б), даклада і заключнага слова таварыша Сталіна. У нас ёсць яшчэ вельмі многа адсталых участкаў у рабоце. Слаба працуе комсамольская арганізацыя, да гэтага часу няма групы спачуваючых, дрэнна працуем з беспартыйным актывам. Над ліквідацыяй усіх гэтых недахопаў мы настойліва будзем працаваць.

Пятроўская —
сакратар парткома

Менск, фабрыка
„Чырвоны тэкстыльшчык"

Група жанчын Віцебскай дэлегацыі на XVI з'ездзе КП(б)Б. Злева направа: тт. Ханіна, Пескіна, Слуцкіна, Палевіч, Смалянская, Багамолава, Раманава, Астроўская, Багданоўская, Міхайлава.

Выбярэм лепшых

Недахопы ў профрабоце, аб якіх гаварыў тав. Швернік у сваім дакладзе на VI пленуме ВЦСПС, цалкам адносяцца і да нашага фабкома. Грубае парушэнне прафсаюзнай дэмакратыі, адрыў ад мас, невыкарыстанне добраахвотнага актыву, ігнараванне культурна-бытавых патрэб рабочых,—усё гэта мае месца і ў нас на фабрыцы.

Фабком выбіралі ў 1933 г. Пасля гэтага некалькі разоў яго „даабіралі". У выніку—усе 6 членаў фабкома аказаліся кааптыраванымі. Да ліку кааптыраваных належу і я. Старшынёй фабкома мяне „даабралі" ў маі гэтага года.

Фабком разгубіў сваіх членаў. З абраных членаў фабкома застаўся толькі адзін тав. Айзенштадт. Нельга знайсці пратакола, дзе запісаны выбары ў фабком. Работніцу тав. Кучынскую абралі ў фабком, але ўстанавіць гэта не ўдалося. Сама яна не памятае, калі яе абіралі. Вось стыль работы нашага фабкома. Фабком не рабіў справаздач перад выбаршчыкамі. Парушэнне прынцыпу выбарнасці і справаздачы перад масамі прывяло да адрыву ад рабочай масы.

Мы дрэнна кіравалі стаханаўскім рухам і соцспаборніцтвам,—у выніку ў нас з 1 700 рабочых і работніц толькі 600 стаханаўцаў. Сувязь членаў фабкома з масамі работніц была слабая. Работніцы не прыцягваліся да такіх важнейшых мерапрыемстваў як ахова працы і тэхніка бяспекі, кантроль над выдаткаваннем сродкаў соцыяльнага страхавання і г. д.

Мы не займаліся палітычным выхаваннем членаў профсаюзаў. Самаўхіліліся ад кіраўніцтва гэтым важнейшым участкам, перадаверылі гэту справу другарадным работнікам.

Толькі пасля лютаўскага пленума ЦК ВКП(б) і VI пленума ВЦСПС мы зразумелі, што дрэнна кіравалі масамі, што мы адарваліся ад мас. Нашаму фабкому неабходна неадкладна перабудаваць сваю работу на аснове рашэнняў пленума ВЦСПС, на аснове сапраўднага дэмакратызма і знішчэння тых недахопаў, якія маюцца ў нашай рабоце.

Што мы ўжо зрабілі?

Першай нашай задачай было давесці да кожнага члена профсаюза рашэнні пленума ВЦСПС. У гэтым нам дапамог партыйны камітэт. Як толькі быў апублікован даклад тав. Шверніка, агітатары і прапагандысты пачалі прапрацоўваць яго па групах і зменах.

Акрамя гэтага члены фабкома правялі глыбокае вывучэнне рэзалюцыі даклада тав. Шверніка з рабочымі ўсіх лент. У выходны дзень—5 чэрвеня фабком арганізаваў выезд профактыва за горад. На гэтай масоўцы праведзены гутаркі аб надыходзячых выбарах па-новаму—пры тайным галасаванні.

У перыяд падрыхтоўкі і правядзення справаздач фабкома і выбараў мы ставім перад прафсаюзным актывам фабрыкі наступныя задачы:

Па-першае, развіццё стаханаўскага руху, павелічэнне ліку стаханаўцаў. Барацьбу за ахову працы, ахоп прафсаюзным членствам усіх рабочых і палітычнае выхаванне.

У нас яшчэ маецца каля 500 рабочых—не членаў саюза. Праўда, усё гэта новыя людзі, якія нядаўна прышлі на фабрыку, у сувязі з арганізацыяй трэцяй змены. За гэты час мы прынялі ў члены саюза больш 80 чалавек.

Як мы практычна будзем праводзіць справаздачу і выбары? Для нас, членаў фабкома, зусім ясна, што паспяховае правядзенне справаздачна-перавыбарчых сходаў залежыць ад іх падрыхтоўкі. Таму мы ў плане адвялі многа месца гэтаму пытанню.

У фабрычна-заводскай газеце будзе надрукован план правядзення справаздачы і выбараў. Справаздачны даклад будзе папярэдне пастаўлен на сходзе шырокага актыву. Сходы членаў профсаюза будуць праводзіцца па зменах.

З 8 па 23 чэрвеня члены фабкома будуць рабіць справаздачы на 6 сходах рабочых. Пасля спрэчак і заключнага слова і прыняцця рэзалюцыі пачнем збор кандыдатур у члены фабкома. Абгаварэнне кандыдатур на гэтым першым сходзе праводзіць не будзем. Усе кандыдатуры ў фабком збярэм у адзін спіс. Потым, на другіх сходах пачнем асабістае абмеркаванне кандыдатур.

Рашэнні пленума ВЦСПС выклікалі ў рабочых нашага калектыва вялікі інтарэс да прафсаюзнай работы. Гэта наглядаецца і ў вывучэнні даклада тав. Шверніка, і ў ажыўленні работы грамадскіх арганізацый.

Члены профсаюза шырока выкарыстаюць свае правы пры выбарах фабкома. Рабочыя і работніцы выбяруць у фабком лепшых стаханаўцаў і ўдарнікаў. Справаздача і выбары—важнейшы момант у жыцці профсаюза і нашага фабкома.

Анастасія Мішчанка

Старшыня фабкома швейнай фабрыкі імя Дзяржынскага

Бабруйск.

Ордэнаносцы Менскай швейнай фабрыкі „Кастрычнік" у часе абедзенага перапынку ў фабрычным клубе. Злева—направа тт. Кісель, В. Еўсюціна і Валошына.

Фото Рабіновіча.

ВЫКАНАЕМ РАШЭННІ ПЛЕНУМА

Набліжаецца час выбараў фабкома. З чым-жа наш фабрычны камітэт падыходзіць да выбараў па-новаму?

Трэба прама сказаць, што працавалі мы дрэнна. У нас груба парушалася профсаюзная дэмакратыя. Быў выпадак, калі ў цэхком абралі не члена саюза. У цэхах былі платныя проф'оргі. Фабком ніколі не рабіў справаздачы перад агульным сходам рабочых. Толькі ў канцы 1936 года фабком зрабіў справаздачу на канферэнцыі рабочых, на якой прысутнічала 300 чалавек, з 3.000 працуючых на фабрыцы.

На гэтай канферэнцыі абралі і мяне старшынёй фабкома. Я паставіла сабе задачай—уцягнуць новых людзей у актыўную работу. У апошні час маладую работніцу—вацершчыцу тав. Шарэнда вылучылі старшынёй цэхкома, а калі ўпэўніліся, што яна здольная і працаваць можа, яе прызначылі брыгадзірам на вацерах. З работай тав. Шарэнда ўпаўне спраўляецца і прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. Работніцу Жынеўскую абралі ў цэхавы камітэт, дзе яна актыўна працуе.

Зараз у нас ва ўсіх цэхах абраны 22 цэхавых камітэта, у якіх у парадку грамадскай нагрузкі працуе 97 рабочых і работніц. Праца ад гэтага толькі выйграла.

Жанчын-работніц на фабрыцы больш 2.000. Рознага віду вучобай ахоплена толькі 800 чалавек. Непісьменных у нас больш 200 чалавек, малапісьменных—300. Фабком дагэтуль не кіраваў і не правяраў работу школ для ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. У выніку гэтага школы працавалі дрэнна, а вылучаныя 10 культармейцаў без дапамогі фабкома не справіліся са сваёй работай.

Жанчын на камандных пастах у нас мала. Праўда, сярод брыгадзіраў жанчын—50 проц. Але зменным майстрам працуе толькі адна тав. Рашчынская, а сярод начальнікаў цэхаў няма ніводнай жанчыны. Такое становішча ставіць перад намі адказную задачу па вылучэнню работніц на адказныя пасады.

90 проц. рабочых ахоплена соцспаборніцтвам. Асабліва ўзняўся у нас стаханаўскі рух у часе Орджанікідзенскага закліка. Былі арганізаваны стаханаўскія вахты імя Серго. План выконваўся на 120—125 проц. Усе спаборнічаючыя ахоплены соцдагаварамі, але фабком не правяраў іх выканання.

Асабліва дрэнна працаваў фабком у галіне аховы працы. У цэхах няма пылесосаў, вентылятары не працуюць. Пад вацернымі машынамі кучы смецця. Спецвопратка своечасова не выдаецца. Быў выпадак, калі на новых вацерах людзі працавалі пры 40 градуснай жары толькі таму, што не працавала вентыляцыя. На валчках вентыляцыйны матор выключаўся з мэтай эканоміі электраэнергіі, а работніцы там задыхаліся ад пылу.

А калі фабком рэзка паставіў пытанне перад дырэкцыяй фабрыкі аб палепшанні аховы працы, дырэктар тав. Захараў прыгразіў пазбавіць работнікаў фабкома прапускоў на фабрыку, бо яму перашкаджаюць у рабоце. Скарыстаўшы мой ад'езд на пленум ЦК Саюза, дырэктар ажыццявіў сваю пагрозу і загадам намесніка дырэктара Яўменава нікога з работнікаў фабкома не прапушчалі на фабрыку. У выніку гэтага галавацяпства 10 дзён работнікі фабкома не былі ў цэхах. Зараз загад адменен.

Работа вытворчых нарад не была наладжана. Пастановы нарад нідзе не запісваліся, не было кантролю за іх выкананнем. Не ўлічваліся дзелавыя прапановы рабочых, і ўпаўне правільна рабочыя заяўлялі, што ім надакучыла ўказваць на вытворчыя непаладкі, бо гэта застаецца толькі запісаным у блакноце дырэктара.

У мінулым годзе фонд соцыяльнага страхавання быў перавыдаткован і скарыстоўваўся не па прамому прызначэнню. Пад выглядам выдаткаў на дыэтхарчаванне грошы скарыстоўвалі на арганізацыю вечароў. Бюлетэні аплачваліся няправільна, усе атрымоўвалі 100 проц. зарплаты, што павялічвала лік сімулянтаў.

Фабком займаўся пытаннем выяўлення людзей, якія не зварачваліся за дапамогай, але адчувалі ў гэтым патрэбу. Пры дапамозе цэхавага актыва мы выявілі такіх 50 чалавек. Гэта ў большасці жанчыны-адзіночкі, якія маюць 3—4 дзяцей на сваім ўтрыманні. Дзяцей мы паслалі на дачу з дзіцячым садам і піонерлагерам. Выдалі ім беззваротныя і зваротныя ссуды з касы ўзаемадапамогі. І зараз становішча гэтых работніц значна палепшылася.

Вялікі процант жанчын у нас у водпуске па цяжарнасці. У сучасны момант іх больш 100 чалавек. Але памяшканне ясляў дазваляе нам расшырыць групы, і ў прыёме дзяцей у яслі мы работніцам не адмаўляем.

У нашых фабрычных яслях знаходзіцца 110 дзяцей. З іх 70 выязджае на дачу, а група груднякоў застаецца тут. Едуць на дачу ўсе 130 дзяцей нашага дзіцячага сада. Дзяцей адпраўляем на дачу за кошт фонда соцстраха і фабкома.

Асабліва дрэнна ў нас на фабрыцы з жыллёвым фондам. Каля 400 сямей рабочых і работніц адчуваюць вострую патрэбу ў кватэрах, а між тым наш будаўнічы аддзел ніяк не можа закончыць будаўніцтва новага дома.

Не гледзячы на тое, што Цэнтральнае праўленне саюза ільняншчыкаў знаходзіцца ў Віцебску, а наша фабрыка з'яўляецца самай буйнай з ільнопрадпрыемстваў Беларусі, нам праўленне зусім не дапамагае ў рабоце. ЦП Саюза адарвана ад рабочых, не ведае умоў іх жыцця і работы, не ц'кав цца гэтым. Ды яно і зразумела. Амаль усе работнікі ЦП кааптыраваны, ніхто з рабочых іх не выбіраў, ніколі яны перад рабочымі не рабілі справаздачы аб сваёй рабоце. Старшыня тав. Кавалеўскі ні разу не быў у нас на пленуме фабкома, ні разу не выклікаў мяне на пасяджэнне праўлення.

Зараз уся наша ўвага звернута на давядзенне да кожнага рабочага і работніцы рашэнняў VI пленума ВЦСПС і на падрыхтоўку да справаздачы і выбараў фабкома. Для дапамогі фабкому вылучан актыў з 35 чалавек. Перад імі пастаўлена задача, каб усе члены саюза вывучалі рашэнні пленума. Склікаем сход профактыва і дакладам аб рашэннях пленума. Намечана правесці непасрэдна ў цэхах 9 сходаў са справаздачай фабкома, абгаварэннем кандыдатур у фабком і выбараў фабкома пры тайным галасаванні.

Нам неабходна карэнным чынам перабудаваць сваю работу.

Кароткая

Віцебск, фабрыка імя Кагановіча.

ФАБРЫКА „КІМ" У ТРЭЦЯЙ ПЯЦІГОДЦЫ

Датэрміновае выкананне плана другой пяцігодкі—бліскучая перамога соцыялістычнага ладу, новы ярчэйшы доказ правільнасці генеральнай лініі партыі, мудрасці палітыкі Леніна—Сталіна.

Краіна рыхтуецца да трэцяй пяцігодкі.

Перад лёгкай прамысловасцю, якая атрымала ў перыяд першых двух пяцігодак моцную сыравінную базу, у трэцяй пяцігодцы ставіцца велізарная задача—падвоіць выпуск прадукцыі, даць краіне прадукцыі ў большай колькасці і высокай якасці.

Абгаварэнне праблем трэцяй пяцігодкі дазволіць пачарпнуць з багацейшага практычнага вопыту мас многа каштоўных ідэй і прапаноў, якія несумненна знойдуць сваё адлюстраванне ў трэцім пяцігадовым плане.

Панчошна-трыкатажная фабрыка „КІМ" па ўдзельнай вазе выпуску панчошных і бялізных вырабаў займае ў Саюзе адно з першых месц.

Асноўнае пытанне нашага плана на 3-ю пяцігодку—гэта пабудова баваўняна-прадзільнай фабрыкі, з абсталяваннем удасканаленых матальных машын. Такая фабрыка ў 150 тысяч верацёнаў зможа забяспечыць сыравінай не толькі нашу фабрыку і фабрыку імя Клары Цэткін, але і іншыя трыкатажныя фабрыкі БССР.

Планам прадугледжваецца значнае палепшанне асартымента панчошна-насочных вырабаў за лік павялічанай выпрацоўкі вырабаў з грэбяной пражы, штучнага шоўку, мерсірызацыі пражы, укаранення аддзелкі.

Для перапрацоўкі ўказанага асартымента праектуецца атрыманне 200 аўтаматаў 22 класаў самабартуючых, выпрацоўваючых жаночыя панчохі высокай якасці (шаўковыя і фельдыкосавыя) і 89 аўтаматаў 17 класаў, вырабляючых наскі з малюнкамі. Асваенне гэтага асартымента значна павялічыць удзельную вагу выпуску высокаякасных жаночых панчох і наскоў.

Выпуск панчошна-насочных вырабаў на 1942 г. намечан у 65,5 мільёнаў пар. Значна вырастае выпуск прадукцыі па швейна-бялізнавых вырабах і верхняму трыкатажу. Супроць выпускаемых у 1937 г. 15,7 мільёнаў штук—фабрыка намячае ў 1942 г. павялічыць выпуск трыкатажных вырабаў да 27 мільёнаў.

Значна павінен змяніцца асартымент палатна для трыкатажных вырабаў, якія будуць вырабляцца на фабрыцы імя Клары Цэткін на машынах „Інтэрлок", быстраходных вярцёлках.

Мяркуецца і неабходна рэканструкцыя фарбавальна-апаратурнага цэха, устанаўленне фарбавых удасканаленых апаратаў, устанаўленне апаратаў для мерсерызацыі пражы, механізацыя сушкі палатна, адбелкі і г. д.

У сучасны момант у нас на фабрыцы працуе 7267 чалавек—рабочых, служачых і ІТР, з іх жанчын 6 тысяч.

У намячаемым плане трэцяй пяцігодкі колькасць рабочых значна ўзрастае. У 1942 г. павінна быць 10700 рабочых, з іх будзе 9.000 жанчын. Такім чынам на фабрыку прыдзе 3.000 новых работніц.

Прадугледжаны план трэцяй пяцігодкі выклікае значныя капіталаўкладанні як па лініі прамысловага будаўніцтва, так і па лініі культурна-бытавога.

Па культбытавых мерапрыемствах прадугледжваецца: пабудова клуба на 1500 чалавек, дома адпачынку на 400 чалавек, пабудова вячэрняга прафілакторыя—на 150 чалавек, пабудова амбулаторыі, санпрапускніка, сталовай на 12.000 абедаючых, лазні, пральні на 500 чалавек, двух дзіцячых садоў на 300 дзяцей, двух ясляў—на 300 дзяцей. Усяго на культ-бытавое будаўніцтва намечана выдаткаваць 7 мільёнаў рублёў. У сувязі з расшырэннем фабрыкі і давядзеннем колькасці рабочых, служачых і ІТР да 12.000 чалавек, намечана значнае расшырэнне жыллёвага фонда. Планам прадугледжана пабудова 18 чатырохпавярховых жыллёвых дамоў з жыллёвай плошчай на 35.000 квадратных метраў.

Таксама намячаецца ўпарадкаванне тэрыторыі фабрыкі, рабочых пасёлкаў, пабудова скверaў, зялёных насаджэнняў і г. д.

Вось што намеціла фабрыка ў сваім плане трэцяй пяцігодкі.

Ханіна—
дырэктар фабрыкі „КІМ"
Віцебск.



Тав. Будовіч — стаханаўка віцебскай швейнай фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі". План выконвае на 230 проц.

НАША РАДЗІМА

ДАЛЁКІ ЎСХОД

Вялікая наша радзіма. Многа ў ёй лясоў, палёў і рэк. Многа ў ёй і новых раёнаў і шпарка растучых гарадоў. Мільёны пяюць аб «валачаеўскіх днях», аб «штурмавых начах Спаска», аб краі казачных багацця ў—Далёкім-Усходзе.

Так, сапраўды Далёкі Усход. Ад Менска да Владзівастока 9979 кіламетраў. Ні адна краіна не ведае такой вялікай тэрыторыі. Адлегласць паміж захадам і ўсходам Злучаных Штатаў Амерыкі ў два разы меншая. І гэты далёкі па адлегласці край нам вельмі блізкі. Мы адчуваем яго дыханне, мы бачым яго рост, мы ганарымся яго казачнымі багаццямі.

Далёкаўсходні край—самая вялікая адміністрацыйная адзінка нашай радзімы. Яна займае адну сёмую СССР. Тут можа ўмясціцца каля 100 Бельгій. Прырода Далёкаўсходняга края вельмі багата кантрастамі, рэзка адчуваецца кліматычны ўплыў з Якуціі і падтрапічных абласцей Ціхага акіяна. Гэта забяспечвае блізкае суседства раслін і жывёл рэзка адрозніваючыхся зон. Гэта край тыгра і аленя, рыса і ягеля, субтрапічнай манчжурскай флоры і палярных раслін, 50 градусных марозаў і 40 градуснай жары.

Царская Расія глядзела на Сібір, у тым ліку і на Далёкі Усход, як на месца катаргі і ссылкі. Не толькі не вывучаліся багацці гэтага края, але нават не было карты Сібіры. Калі пачалі пракладваць першыя рэйкі сібірскай магістралі, карту Сібіры рускія інжынеры атрымалі з... Берліна.

Шырокі размах работ на Далёкім Усходзе адзначае для нас адкрыццё сваёй Амерыкі. Адны запасы леса вызначаюцца ў 6,8 мільярдаў кубаметраў, з гадавым прыростам дрэвесіны да 100 мільёнаў кубаметраў. Кедр, дуб, бяроза, топаль—на поўдні, ель, піхта, асіна, лісцвеніца—на поўначы. Лясы захоўваюць у сябе выдатныя будаўнічыя і экспартныя магчымасці. Акрамя таго, тут ёсць хімічная сыравіна: фармалін, смала, цэлюлоза і спірт. Лес—гэта папера, запалкі, мэбля.

Край багат каштоўнейшай рыбай і марскім зверам. Сялёдка сустракаецца тут у незлічонай колькасці. Кета і гарбуша, якія масамі падымаюцца для мятання ікры ў рэчках, робяцца здабычай не толькі чалавека, але і жывёлы. Тут жыве некалькі відаў кітоў, бялухі, цюленя і маржа. Тут жыве марскі коцік і марскі бобр, якія даюць вельмі каштоўныя футры.

Край асабліва багат вугалем і рознай рудой. На 11 тысяч квадратных кіламетраў цягнуцца вугляносныя плошчы Бурэі. Па далёка непоўных даных геалагічных разведак, Бурэя мае запасу вугалю ў 120 мільярдаў тон, г. зн. прыкладна, два Данбасы.

Бурэя заклікана адыграць вялікую ролю ў развіцці народнай гаспадаркі Далёкага Ўсхода. Край прад'яўляе з кожным годам усё больш і больш патрабаванняў на паліва. Адна Байкала-Амурская магістраль, якая цяпер будуецца, будзе патрабаваць паўтары мільёна тон вугалю для паравозаў. А радам з Бурэяй знаходзяцца магутныя жалезарудавыя месцазнаходжанні ў Малым Хінгане. Жалеза ў гэтай рудзе маецца 62 процанта. Саюз вугалю і жалеза стварае новую металургічную базу на Далёкім Ўсходзе.

Сельская гаспадарка Далёкаўсходняга края таіць у сябе багацейшыя магчымасці развіцця зернавых і тэхнічных культур—соі, рыса, цукравых буракоў, магчымасці пчалаводства, шоўкаводства.

Раскрываючы гэтыя багацці і ўкладаючы ў край велізарную колькасць працы і сродкаў, совецкая ўлада тыганцкімі тэмпамі перабудоўвае старыя гарады і стварае новыя прамысловыя і культурныя цэнтры ў глыбінях края.

Зусім нядаўна былі ўзнагароджаны ордэнамі будаўнікі вялікага вадаправода ў Владзівастоке. Дробныя калодзежы і прымітыўны вадаправод не маглі забяспечыць вадой горад і порт. Паравозы напаўняліся вадой воддаль ад горада. Совецкія параходы, ідучы ў далёкія рэйсы, заходзілі ў японскія парты, каб на час рэйса забяспечыць сябе вадой. Трыста іен бралі японцы за бункероўку аднаго парахода. Тысячы залатых рублёў плаціла наша дзяржпараходства японцам за ваду. Некалькі год энергічна вяліся работы на рацэ Седаі-Хэ, і Владзівасток атрымаў у дастатковай колькасці ваду.

А вось і Калыма. Нараджаецца край, ажываюць яго багацці, новым жыццём пачынаюць жыць яго народы. І ў гэтай краіне сопак, рэчак і тундры праводзяцца дарогі, з'явіўся аўтамабіль.

У горнай Калыме растуць гарады. У некалькіх кіламетрах ад бухты Нагаева вырас горад Магадан—цэнтр края. Тут вялікія дамы, электрычнае асвятленне, вадаправод, тэлефон, радыёстанцыі, клубы і два гукавых кіно. У Магадане выпускаюцца дзве газеты, сярод іх цэнтральная «Колымская правда».

А на Сахаліне? «Гіляцкая зямля» была ўключана ў склад былой Расійскай імперыі царскім загадам 1853 года. Адным з першых урадавых мерапрыемстваў было стварэнне на ёй катаргі. Пры гэтым царскі ўрад карыстаўся наступным апраўданнем такіх рашэнняў: «Геаграфічнае становішча востраў Сахаліна, аддзеленага морам ад ускрайніх рубяжоў Расіі, забяспечвае ад пабегаў, бо яны вельмі

Лабаранткі Балотнага інстытута Люба Шмідт і Ліда Гендліна паехалі на Далёкі Усход. Фота Раскіна.

цяжкія і амаль немагчымы». І Сахалін ператварыўся ў адзін з найбольш жудаснейшых катарг царскай Расіі.

Сёння-ж некалі пануры выгляд востраў ажывіўся тысячамі кропак электрычнага святла. Нафта пацякла па 10-дэюймоваму нафтаправоду к заходняму берагу Сахаліна. У 12 кіламетрах ад берага Ахоцкага мора, упіраючыся ў неба дзесяткамі буравых вышак, казачна расце цэнтр сахалінскай нафтапрамысловасці—горад Оха.

Соцыялістычнае будаўніцтва раскрыла велізарнейшыя перспектывы для прамысловага і культурнага развіцця края. Край абкружан асаблівай увагай ЦК нашай партыі, таварыша Сталіна і наркома абароны таварыша Варашылава. Галоўнае цяпер—у засяленні края. Край адчувае патрэбу ў людзях розных кваліфікацый, людзях энергічных, жыццерадасных, людзях, любячых сваю радзіму.

Тысячы совецкіх дзяўчат з усіх канцоў нашай неабдымнай радзімы едуць на Далёкі Ўсход. З кожным днём іх колькасць будзе расці і расці. Малады край энергічна папаўняецца моладдзю, расце і квітнее, з'яўляючыся магутным фарпостам соцыялізма на берагах Ціхага акіяна.

ЛІБЕРМАН.

ГАДАВІНА ДЭКРЭТА

Год таму назад, 27 чэрвеня 1936 г., ЦВК і СНК СССР зацвердзілі пастанову аб забароне абортаў, павелічэнні матэрыяльнай дапамогі роджаніцам, устанаўлення дзяржаўнай дапамогі многасямейным, расшырэнні сеткі радзільных дамоў, дзіцячых ясляў і г. д. Толькі ў нас—у краіне перамогшага соцыялізма—можна было прыняць такі дэкрэт, які асабліва яскрава выражае Сталінскія клопаты аб жанчыне-маці і дзецях.

Усім памятна, з якой актыўнасцю абмяркоўваўся праект дэкрэта ва ўсіх кутках нашай радзімы. Работніцы, калгасніцы, служачыя, хатнія гаспадыні ўносілі свае дадаткі і прапановы, якія былі ўлічаны ўрадам. З вялікім адабрэннем і радасцю сустрэў увесь совецкі народ дэкрэт. Гэта радасць яскрава была выражана ў пісьме работніц „Трохгорнай мануфактуры“ да таварыша Сталіна:

„Многім з нас, ткачыхам і прадзільшчыцам, давялося выпіць горкую чашу пакут і рабскага зневажэння на прохараўскай фабрыцы. Хмурым, цёмным, як магіла, было наша жыццё. Мы раджалі ля станкоў, страшныя пагрозы звальнення і голада віселі над намі пастаянна. Мала слоў было, а гора—рэчанька, гора—рэчанька бяздонная.

Зараз жыццё—квітнеючы май. Нашы дзеці і ўнукі, як макі квітнеюць — жыццерадасныя і шчаслівыя“.

Дэкрэт бліскуча праводзіцца ў жыццё. Намнога ўзрасла нараджальнасць у нашай краіне. За пяць месяцаў 1937 года ў Маскве нарадзілася 56376 дзяцей,—на 26205 больш, чым за той-жа перыяд мінулага года. Аб росце нараджальнасці ў БССР сведчыць такі факт: у менскіх радзільных дамах за ўвесь 1936 г. нарадзілася 6470 дзяцей, а за чатыры месяцы 1937 г.—3390.

Сотні мільёнаў рублёў атрымалі за гэты год многасямейныя мацеры. Як горача дзякуюць вялікага Сталіна шчаслівыя мацеры нашай краіны! У пісьме ў нашу рэдакцыю работніца Полацкай чыгункі Анастасія Шаркевіч піша: „Ад шчырага сэрца прыношу таварышу Сталіну падзяку за шчаслівае жыццё і дапамогу, якую я атрымала на выхаванне дзяцей. Я даю мацярынскае слова—усіх сваіх дзяцей выхаваць адданымі барацьбітамі соцыялістычнай радзімы“.

Многія пункты дэкрэта ў БССР ажыццяўляюцца дрэнна. Велізарныя сродкі, адпушчаныя ўрадам нашай рэспублікі для будаўніцтва дзіцячых ясляў, садоў, павелічэння колькасці радзільных ложкаў, поўнасцю не скарыстоўваюцца. Будаўніцтва ў многіх мясцах зрываецца. З асігнаваных 8 мільёнаў 600 тысяч рублёў выдаткавана толькі 7 з паловай мільёнаў. Да гэтага часу яшчэ не ўвайшло ў эксплаатацыю 14 аб'ектаў, якія павінны былі распачаць работу яшчэ ў канцы мінулага году. Не лепш праходзіць будаўніцтва і ў гэтым годзе. План яго выканан толькі на 14 проц.

У Менску, у канцы мінулага года, павінны былі скончыць тры новых двухпавярховых будынкі для дзіцячых ясляў на 280 ложкаў. Ні адзін з гэтых будынкаў поўнасцю яшчэ не скончан. Гэта ў той час, калі ў Менскім Горздраве ляжаць сотні заяў мацярэй аб прыняцці дзяцей у яслі.

Не мала прыгожых слоў выказалі кіраўнікі Бягомельскага, Багушэўскага, Чырвонапольскага і іншых раёнаў аб уважлівых адносінах да жанчыны-маці. У гэты самы час яны палец аб палец не ўдарылі для забяспечання калгасніц іх раёнаў радзільнай дапамогай. Вялікую трывогу выклікае становішча з адчыненнем хат-радзільняў па БССР. 489 хат-радзільняў павінны працаваць у гэтым годзе. Пакуль працуюць толькі—230.

Беражліва і любоўна адносіцца да чалавека—вучыць нас партыя і таварыш Сталін. Гэта патрабаванне асабліва датычыцца тых устаноў, якія звязаны з мацярамі. На жаль, у нас ёсць вельмі многа фактаў, калі ў лекавых установах груба, няўважліва адносяцца да жанчын.

Нядаўна мы пісалі пра самадура Паўлоўскага—доктара Шклоўскай бальніцы, які здзекваецца над радзіхамі. Дрэнна адносяцца да радзіх у Жлобінскім і ў іншых радзільных дамах. Многа скардзяцца мацеры і на работу дзіцячых кансультацый. У Менску, Віцебску, Пухавічах і інш. мацеры вымушаны па некалькі гадзін чакаць прыёму ўрача. У кансультацыях мала або зусім няма ізалятараў для хворых дзяцей. Многа непаладкаў і ў рабоце малочных кухань.

Наркамздраў БССР, які ў першую чаргу павінен займацца пытаннямі аховы мацярынства і дзяцінства, вельмі мала ўдзяляе гэтаму ўвагі. Шматлікія сігналы аб дрэннай рабоце радзільных дамоў і дзіцячых устаноў застаюцца непачутымі. Не турбуе Наркамздраў і тое, што зрываецца вызначанае па плану будаўніцтва. Гэты стыль работы пераймаюць многія горздравы і райздравы, у прыватнасці, загадчык Менскага горздрава тав. Шульц. Работа дзіцячых устаноў і клапоты аб іх у яго стаяць на апошнім месцы.

Нашы актывісткі—жанчыны-мацеры павінны прыняць актыўны ўдзел у выяўленні непаладкаў работы дзіцячых устаноў і радзільных дамоў. У праходзячых зараз справаздачна-выбарчых сходах профорганаў работніцы і служачыя павінны разгарнуць шырокую крытыку недахопаў работы дзіцячых устаноў. Актыўны ўдзел у рабоце ясляў, дзіцячых пляцовак і хат-радзільняў павінны прыняць і нашы калгасніцы.

Совецкім дзецям забяспечана шчаслівейшае ў свеце дзяцінства. Сотні тысяч рэбят выехалі на лета на дачы, у лагеры, санаторыі. Мацеры спакойны ў нас за сваіх дзяцей, як спакойны яны за сваё шчаслівае жыццё. І гэта жыццё яны будуць абараняць ад усіх ворагаў: фашыстаў, подлых трацкістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў і ўсякай іншай сволачы.

Адзначаючы гадавіну са дня апублікавання дэкрэта, гарачыя патрыёткі сваёй радзімы—совецкія жанчыны яшчэ цясней згуртоўваюцца вакол комуністычнай партыі і любімага правадыра народаў таварыша Сталіна.

ШЧАСЛІВЫЯ МАЦЕРЫ

ІХ МНОГА

Сустрэліся дзве калгасніцы сярэдніх гадоў—Лізавета Пташнік з калгаса імя Дзяржынскага і Анна Грынкевіч з калгаса „Палітаддзелец". Прывіталіся. На іх вуснах—вясёлая ўсмешка. У словах гучыць радасць. Жанчыны гавораць аб сваіх малышах, аб сынах і дочках.

Лізавета—маці дзевяці дзяцей. Двое ўжо ў школу ходзяць.

У Анны восем дзяцей, з іх трое школьнікаў, а старэйшая дачка—Зіна—працуе ў піонерскім атрадзе.

Лізавета і Анна ганарацца сваімі дзецьмі. Гэты гонар совецкай мацеры дала ім радзіма соцыялізма. Гэты гонар прынёс ім любімы бацька народаў—таварыш Сталін.

Разам з тт. Пташнік і Грынкевіч атрымалі дзяржаўную дапамогу па 2000 руб. многа такіх-жа шчаслівых мацярэй.

Юзя Палянская—маці сямі дзяцей. Яе малодшыя дзеці знаходзяцца ў яслях, а Юзя працуе даяркай у сваім калгасе „Большэвік". Яна доіць 11 кароў і даглядае 20 цялят.

121 маці па нашаму раёну атрымалі грашовую дапамогу ад дзяржавы. 242 тысячы рублёў выдана ў дапамогу на выхаванне дзяцей краіны соцыялізма.

Іх многа шчаслівых мацярэй, якія жывуць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

С. Хаміцэвіч

Плешчаніцкі раён.



У сталінскіх яслях Віцебскага горсовета.

(Б. Д. К.)

ДРУЖНАЯ СЯМ'Я

Многа год пражыла Наста. Яе дзеці выраслі, выйшлі ў людзі. Сын Сцяпан—комсамолец, скончыў зоатэхнікум. Зараз ён сакратар комсамольскага камітэта пры Беліцкім зоатэхнікуме. Другі год знаходзіцца ў пагранічным атрадзе сын Тарас. Разам з другімі пагранічнікамі ён трымае на моцным замку рубяжы соцыялістычнай радзімы. Малодшыя вучацца ў школе.

Партыя і ўрад стварылі ўсе ўмовы для шчасця совецкіх дзяцей. Наста Рыгораўна па многасямейнасці атрымала 2 тысячы рублёў. Купіла дзецям бялізну, падрыхтавала падарункі за выдатную вучобу.

Багата жыве сям'я Насты Лазарэвіч. 857 працадзён выпрацавалі ўтрох і атрымалі не мала. Толькі ў калгасе, у калектыўнай працы сялянка знайшла сваю лепшую долю.

Позняк

Сеннеңскі раён, калгас „Комунар".

НАШ АДКАЗ.

У мяне сямёра дзяцей. На іх выхаванне я атрымала дзяржаўную дапамогу—2.000 рублёў.

Радасці маёй не было канца. На атрыманыя грошы я купіла дзецям паліто, валенкі, мануфактуры. Старшыя дзеці вучацца, разам з імі вучуся і я. Сама чытаю ўжо газеты, кніжкі. Сталінскую Канстытуцыю вывучала самастойна, нават і суседкам чытала.

Раней аб такім жыцці, як зараз, і марыць я не смела. Я расла ў вялікай сям'і, маці засталася ўдавой, а мы былі ўсе малыя і ў дзяцінстве шмат пакутавалі.

А цяпер толькі чэсна і добрасумленна працуй у калгасе і за работу атрымаеш столькі, што можна заможна жыць.

Актыўнай работай у калгасе адкажам мы, многасямейныя мацеры, на тыя клопаты, якімі нас абкружае наша партыя і ўрад. Да гэтага я заклікаю ўсіх многасямейных мацярэй.

Наталья Шынько

Расонскі раён, калгас „VII з'езд".

МАЯ РАДАСЦЬ

Сама я з пагранічнага калгаса „Новая культура". У калгасе ўвесь час працую актыўна. У 1936 годзе была звеннявой па ільну, калгас мяне прэміраваў за высокаякасны лён.

Я атрымала дзяржаўную дапамогу —2000 рублёў на выхаванне дзяцей. Хто раней думаў аб нас? Адвеку было так, што шматсямейная маці была самай цёмнай і адсталай жанчынай. А зараз зусім другое. Аб нас і нашых дзецях клапоціцца наша партыя, наш урад. У адказ на Сталінскія клопаты мы павінны даць здаровае і моцнае пакаленне і, акрамя таго, мы павінны актыўна працаваць у калгасах, дапамагаць умацоўваць іх.

Я ўжо маю двух дарослых сыноў. Яны рыхтуюцца хутка пайсці ў Чырвоную армію. Старшы працуе ў Боркавічах, а восемнацацігадовы—у калгасе. Малодшыя дзеці вучацца ў сталінскіх школах, удзельнічаюць у грамадскім жыцці. Я не нарадуюся гледзячы на іх шчаслівае жыццё.

Александра Геропак

Дрысенскі раён.

Нам пішуць

ВЫЙГРАЛА 1600 РУБЛЁЎ

Я заўсёды падпісвалася на пазыкі, якія выпускала наша дзяржава.

У капіталістычных краінах выпускаемыя шматлікія пазыкі яшчэ больш пагарша оць становішча рабочага класа. Пазыкі там выпускаюцца для ўзмацнення падрыхтоўкі вайны.

А ў нас--пазыкі ідуць на сацыялістычнае будаўніцтва нашай краіны, на яшчэ большае паляпшанне матэрыяльнага становішча працоўных.

У мяне было больш чым на 1.000 рублёў аблігацый пазыкі „Другой пяцігодкі" (выпуск чацвертага года). Па першаму тыражу, які адбыўся 25 мая гэтага году, на 500 рублёвую аблігацыю я выйграла 1600 рублёў. За гэтыя грошы я куплю добрую шафу, швейную машыну, футравую шубу, для дачкі і сына новыя паліто.

Калі толькі наша дзяржава выпусціць яшчэ адну пазыку, я з радасцю зноў падпішуся на яе, бо як дзяржава, так і працоўныя ў нас маюць вялікую карысць ад пазык.

Лавіт--работніца друкарні „Звязда"

Менск.

У ЛАБАРАТОРЫІ

Тут заўсёды ціха. Зрэдка цішыню парушае стук ступкі ці галасы начальнікаў цэхаў, якія прыходзяць даведацца аб аналізах. Сцены ўтульнага памяшкання лабараторыі застаўлены вялікімі шафамі, якія запоўнены зверху да нізу прабіркамі, колбачкамі, бутэлькамі з кіслотамі і рознымі прыборамі. Такія-ж прыборы, колбачкі і прабіркі расстаўлены і па доўгаму сталу, за якім робяць аналізы.

Звычнымі рухамі лабарантка Эця Рабіновіч хутка пералівае вадкасці з адной колбачкі ў другую, грэе іх на плітцы, фільтруе праз вату і запісвае атрыманыя паказчыкі.

— Я выхаванка ленінскага комсамола,—з гордасцю гаворыць Эця,—яму я абавязана ўсім. Я імкнуся скарыстаць кожную гадзіну, каб расці і быць карыснай нашай цудоўнай радзіме.

16-гадовай дзяўчынкай паступіла Эця на кандзіцерскую фабрыку „Чырвоны харчавік" бронь-вучаніцай, а праз некаторы час яе перавялі ў лабараторыю.

Ветліва сустрэлі новую працаўніцу тэхнікі і лабаранткі, а загадчык лабараторыі — комсамолка Фаня Шульман клапатліва падоўгу растлумачвала Эці, як рабіць той ці іншы аналіз, якімі карыстацца пры гэтым прыборамі.

А праз год Эця была ўжо добрай лабаранткай-практыкам, але ёй нехапала тэарэтычных ведаў. У 1936 годзе дырэкцыя фабрыкі накіравала яе ў Менск на курсы хімікаў.

З маладым комсамольскім запалам узялася Эця за вучобу і скончыла курсы па ўсіх дысцыплінах на „выдатна".

Зараз ужо Эця мае і тэарэтычную і практычную падрыхтоўку. Але расце яна не толькі на сваёй асноўнай рабоце. Многа працуе Эця над павышэннем свайго палітычнага і культурнага ўзроўню. Яна акуратна наведвае палітшколу, займаецца фізкультурай. Многа чытае мастацкай літаратуры.

Добрасумленна выконвае Эця дадзеную ёй нагрузку піонерважатага. Рэбята вельмі любяць і паважаюць яе.

Заветная мара Эці—быць пілотам, і гэтая мара хутка стане сапраўднасцю.

Баравікова

Бабруйск.

РЫХТУЕМСЯ ДА ЎБОРАЧНАЙ

Калгас імя Ланцуцкага веснавую сяўбу скончыў да 1 мая. Апрацоўка глебы была добраякаснай, гной і торф вывезены па плану. Усходы дружныя і добра растуць.

Пасля пасеўнай пераключыліся на праполачную. Прапалолі азімую пшаніцу, праводзім праполку і падкормку ільну. Калгасніцы і калгаснікі арганізавана выходзяць на работу. Усе радуюцца дружным усходам, бо ведаюць, што іх праца будзе добра аплачана.

Ужо вывезлі 400 тон торфу і тры тоны ўгнаенняў пад азімыя пасевы. Паравы клін ужо ўзараны, вызначаны рэкордныя ўчасткі.

Рыхтуем жняркі, веялкі і іншыя ўборачныя машыны, каб сустрэць уборачную ў поўнай гатоўнасці.

В. Хадаровіч

Магілеўскі раён.

БУДУ ЎРАЧОМ

Я хачу быць урачом. І абавязкова буду, бо ў школе нас добра вучаць і сама я вельмі стараюся. А самае галоўнае гэта тое, што пра нас клапоціцца наш родны бацька—Сталін. У школе вучыцца і мой брат.

Гледзячы на нас, шчасліўцаў, наша маці нам часта расказвае, як горка жылося ёй пры царскай уладзе, калі працоўным не давалі магчымасці вучыцца. Вось чаму яна засталася непісьменнай і толькі зараз ліквідуе сваю непісьменнасць.

Мы, дзеці Совецкага Саюза, самыя шчаслівыя дзеці ў свеце. Нас сагравае гарачае сонейка і гэта сонейка ёсць—Сталін.

Люба Міроненка—

дачка работніцы камбіната імя Гікало

Нова-Беліца.

Трактарысткі Палесся

Густыя маршчыны меж, латкі аблогаў, якія калупалі сахой галодныя беднякі, абліваючыся горкімі слязьмі, стогны сялян, не маючых коней, плач ды енкі—вось як выглядала калісьці Палессе.

З 96.552 гектараў зямлі, якую займае Камарынскі раён, 46 тысяч гектараў лепшай зямлі належала памешчыкам, 12 тысяч гектараў—царквам і кулакам. Сялянам заставаліся пяскі ды балоты. Кастрычніцкая рэволюцыя змяніла аблічча Палесся.

Няма ўжо таго Палесся, дзе завывалі ваўкі ды перагукаліся філіны. Няма яго. Сёння ёсць новае Палессе—сагрэтае залатымі праменнямі Сталінскай Канстытуцыі. У калгасных хатах гарыць лямпачка Ільіча, ёсць клубы, яслі для дзяцей.

Аб тым, наколькі выросла жанчына Палесся, сведчаць 15 новых трактарыстак, якія навучаліся на курсах пры Іолчанскай МТС.

Пераважная большасць з іх—дзяўчаты. Вось, скажам, Надзя Кароткая. Яна прышла на курсы з ведамі ў адну групу. Але любоў да сваёй справы, нястомная работа над сабой зрабілі яе трактарыстам першай катэгорыі. За добрую вучобу дырэкцыя МТС прэміравала яе. На клопаты партыі і ўрада Надзя адказала канкрэтнай работай.

— Даю слова: узараць у гэтым годзе на сваім трактары не менш 1200 гектараў і з'эканоміць 2 тоны гаручага і выклікаю астатніх трактарыстаў на соцспаборніцтва.

Выклік Надзі Кароткай прыняла яе падруга Насця Мельнік. Усе 15 дзяўчат-трактарыстак уключыліся ва ўсесаюзнае спаборніцтва жаночых трактарных брыгад. Яны ўзялі на сябе наступныя абавязацельствы: выпрацаваць на трактар 1.000—1200 гектараў і з'эканоміць па 2 тоны гаручага за сезон; нястомна павышаць свае веды, культуру, кожнай навучыць трактарнай справе 1—2 дзяўчат-калгасніц.

За час веснавога ворыва Надзя Кароткая на трактары „Сталінец" узарала 148 гектараў, Каця Мельнік—145. Астатнія дзяўчаты ўзаралі ад 120 да 140 гектараў. Кожная трактарыстка з'эканоміла не менш 100 кілограмаў гаручага.

Жаночая трактарная брыгада, у якую ўваходзяць комсамолкі Марыя Казёл і Антаніна Мацапура, замест 110 гектараў на трактар, вызначаных планам Наркамзема, узаралі 183 гектараў кожная, з'эканоміўшы па 300 кілограмаў гаручага.

Вось што расказвае аб сабе лепшая ў Іолчанскай МТС трактарыстка Марыя Казёл.

— Жыла я калісьці вельмі дрэнна. Ніколі ў сям'і нехапала хлеба. Ад вясны да восені батрачыла. Цяпер я кірую машынай. Упэўнена, што ўзятае мною абавязацельства—узараць на трактары „Сталінец" 1200 гектараў і з'эканоміць 2 тоны гаручага—выканаю.

Галоўныя работы яшчэ наперадзе. Тав. Казёл штодзённа замест 3 гектараў узорвае па 4,8 гектараў і больш.

На калгасных палях Камарыншчыны 15 маладых трактарыстак змагаюцца за 1200 гектараў на трактар і эканомію 2 тон гаручага.

У гэтым спаборніцтве, як паказаў першы этап—паспяховае правядзенне веснавой сяўбы,—дзяўчаты стрымаюць сваё слова. Зараз яны заканчваюць ворыва папараў.

Курловіч

Камарынскі раён.

Прося Шабашова—брыгадзір жаночай трактарнай брыгады Высачанскай МТС.

ЯСЛІ НЕАБХОДНЫ

Практыка мінулых гадоў паказала, што ў калгасах, дзе добра была арганізавана работа дзіцячых ясляў, павялічвалася рабочая сіла, за лік калгасніц-маці. Гэта давала магчымасць калгасам своечасова і добраякасна выконваць усе неабходныя работы.

Асабліва дапамагаюць яслі ў правядзенні веснавой сяўбы і ўборцы ўраджаю. Гэту вялікую дапамогу яшчэ не навучылася заўважаць пераважная большасць старшынь калгасаў Клімавіцкага раёна. У выніку ў выключнай большасці калгасаў дзіцячых ясляў зусім няма.

У калгасе „Баявік", Малашкавіцкага сельсовета, з прычыны адсутнасці ясляў не выходзяць на работу многа жанчын. Не працуюць яслі ў калгасах імя Калініна і „Полымя" гэтага-ж сельсовета.

У мінулым годзе, у часе ўборачнай кампаніі ў калгасе „Усход", Гусарскага сельсовета, былі арганізаваны дзіцячыя яслі. Калгасніцы, якія мелі маленькіх дзяцей, спакойна ўдзельнічалі ў рабоце. Уборачная была праведзена паспяхова. Але значэння ясляў не ўлічылі ў часе веснавой сяўбы праўленне арцелі і былы старшыня Давыдзенка.

Дзіцячыя яслі тут не адчынілі. Дзіцячыя ложкі, талеркі, лыжкі, прасцінкі і шмат іншых рэчаў, якія былі набыты для ясляў у мінулым годзе, зараз расцягнуты.

Такое-ж становішча і ў астатніх калгасах Гусарскага сельсовета. З 10 калгасаў толькі ў адным ёсць яслі. Вось чаму не выходзяць на работу сем жанчын з калгаса „Правда" і 13 калгасніц з калгаса „Соцземляробства". А тыя калгасніцы, якія выходзяць на работу, пакідаюць дзяцей дома без догляду.

Старшыні сельсоветаў не цікавяцца работай ясляў, і зусім бяздзейнічае ў гэтай галіне Клімавіцкі райздраў. Работнікі Райздрава, замест дзелавітай, большэвіцкай дапамогі ў рабоце дзіцячых ясляў, пішуць бюракратычныя цыркуляры.

Трэба змяніць адносіны да дзіцячых ясляў. Яны неабходны кожнаму калгасу, бо гэта ў вялікай меры дапамагае калгасам ў правядзенні палітычна-гаспадарчых кампаній.

П. Барысенка

Клімавіцкі раён.

КУРТ ГАУЗНЕР

Ліна Одэна

У Барселоне быў ціхі вечар. З мора цягнула свежым ветрыкам, на поўдні вырысоўваліся ў ясным небе абрысы гары Хоуі, блакітныя і далікатныя.

Лёгкія шагі былі чутны па вуліцах. Сэрца маленькай цёмнавокай дзяўчыны забілася мацней. Урэшце-такі яна была перад домам, адрас якога яна пазнала з цяжкасцю. Увайшоўшы туды, яна апынулася перад пісьмовым сталом, за якім сядзеў чалавек. Гэта быў Гамон Касанельяс, адзін з правадыроў комуністычнага руху, чаго яна тады яшчэ не ведала.

Чалавек за пісьмовым сталом прыняў яе з бацькоўскай заклапочанасцю.

— У чым справа?—запытаў ён.

— Я прашу прыняць мяне ў рады комуністычнай партыі!

Гамон Касанельяс здзівіўся: як, гэтае дзіця, гэтая дзяўчынка?..

— І прашу зараз-жа даць мне работу.

Касанельяс паступова прыходзіў у сябе.

— А што ты раней рабіла?—спытаў ён.

— Я следавала ўказанню Леніна,—прагучэў цвёрды адказ.

— Якому?—зацікавіўся Касанельяс, хаваючы ўсмешку.

— Ленін-жа сказаў: „вучыцеся“. Вось я і чытала, што толькі магла дастаць. Я ўжо падрыхтавалася да работы...

— Як цябе завуць?—спытаў Касанельяс.

— Ліна Одэна.

... Маленькая Ліна ўсе сілы аддавала рабоце. Яе энтузіязм захапляў і іншых. Вакол яе збіраліся гурткі, групы моладзі, жанчыны. Яе палюбілі на фабрыках і прадпрыемствах Барселоны. Ліна стала правадыром комуністычнай моладзі Каталоніі.

Надышоў фатальны кастрычнік 1934 года. Барселона была падобна парахавой бочцы, якая гатова ўзарвацца з мінуты на мінуту. Над Іспаніяй навісла чорная хмара фашызма. Ва ўрад увашоў Хіль Роблес, правадыр іспанскіх галаварэзаў.

Парахавая бочка ўзарвалася, узрыў страсянуў усю паўночную Іспанію. У Астурыі, у Біскайі, у Каталоніі рабочыя ўзялі вінтоўкі



Урадавыя войскі, „рэгуларэс“, пра якіх ішла дурная слава, уварваліся на вуліцы Барселоны. Яны хацелі зніштожыць байцоў за свабоду.

— Гэтымі гадамі, як быццам, камандуе дзяўчына, — сказаў адзін афіцэр сваім салдатам.— Кажуць, яна вельмі прыгожая...

Салдаты нахабна зарагаталі.

... А наогул — сапраўдны чорт!—прадаўжаў афіцэр.—Хто прывядзе яе жывой у штаб, атрымае грашовую ўзнагароду і павышэнне!

Салдаты пагналі шпарчэй коней. З дзікай, нахабнай лаянкай кінуліся яны на мужных байцоў.

Патрэбны былі моцныя нервы, каб даць адпор шалёнаму націску. Кулямёты праціўніка абстрэльвалі барыкады. З прабітых мяшкоў сыпаўся пясок.

Нагнуўшыся ля байніцы, Ліна Одэна заражала вінтоўку.

— Агонь, кампаньерас!—камандвала яна.

Барыкада супраціўлялася.

У паветры было шэра ад пораху і абсыпанай вапны.

— Што з табой, Ліна?— запылены баец з пачарнеўшым тварам кінуўся да байніцы. Гэта быў малады дэ-Аро, адзін з бліжэйшых таварышоў Ліны Одэны.

— Здаецца я паранена...— Па руцэ Ліны цякла кроў, але раны не было відаць.— Я нічога не адчуваю... Андрэс, не будзем траціць часу!

Яна паглядзела праз значна пашкоджанае ўмацаванне.

Некалькі салдат рэгулярных войск краліся да ўпартай крэпасці, якая загараджала ўваход у квартал. Яны неслі ручныя гранаты і рыхтаваліся кінуць іх за барыкаду.

— Кулямёт сюды!—прагучэла каманда Ліны.— Агонь!

Кулямёт затрашчаў. Гранаты ворага разарваліся на вуліцы перад барыкадай.

Ліна Одэна апусцілася на калені. Страта крыві аслабіла яе цела. Але дух і воля былі паранейшаму моцнымі.

— Мы застанемся тут да апошняга патрона, таварышы!.. Будзем прыкрываць нашых...

Калі стала цёмна, людзі перанеслі Ліну ў бяспечнае месца.

„Рэгуларэс“ штурмам узялі барыкаду. На вялікі свой жаль, яны не знайшлі там камандзіра. Салдаты перарылі ўсе куткі Барселоны. Ліна Одэна выслізнула ад іх.

На вуліцах многа было праліта крыві іспанскага народу. У Астурыі гераічных гарнякоў расстрэльвалі сотнямі. Пачаліся сумныя дні так званага „чорнага двухлецця“. Урад з фашыстам Хілем Роблесам на чале пагрузіў сонечную Іспанію ў змрок крывавых жахаў...

Але іспанскі народ не здаўся. Астурыйскія гарнякі хавалі

сваіх таварышоў з думкай аб будучай бойцы.

Ліна Одэна была цяпер членам ЦК комсамола. Яе паслалі ў Астурыю. Яна выступала, агітавала. З яе вуснаў зрываліся гарачыя, шчырыя словы, якія глыбока пранікалі ў душу. Яна стаяла плячом к плячу з палкай Пасіонарыяй. Абедзве гэтыя жанчыны дабіліся на ўзбярэжжы Біскаіі перамогі народнага фронта, выйгралі магутную бойку, якая 16 лютага 1936 года вызваліла народ ад самавольства фашысцкіх правіцеляў.

За некалькі гадзін да генеральнага мецяжа ў Мароко Ліна з'явілася ў сакратарыяце Аб'яднанай соцыялістычнай моладзі ў Мадрыдзе.

— Ліна, ты едзеш у Альмерыю!—сказалі ёй.—Там ты падрыхтуеш аб'яднаную канферэнцыю моладзі...

Ліна не стала траціць часу і паехала проста на вакзал.

Калі яна прыехала ў Альмерыю, мяцеж ужо пачаўся. На вуліцах партовага горада ішлі баі.

Яна з'явілася ў партыю. Сакратарыят быў падобны на баявы штаб.

— Мяне прыслалі з Мадрыда...

— Што табе трэба?—спытаў нехта на бягу.

— Рэвальвер або вінтоўку!

У той-жа дзень Ліна Одэна стаяла на чале калоны рабочай міліцыі, якая наносіла мяцежнікам удар за ударам. Ліна скарыстала вопыт вулічных боек у Барселоне. Яна была сэрцам, яна была душой, правадыром, якога ўсе любілі і паважалі.

Мяцеж у Альмерыі быў падаўлен, але барацьба прадаўжалася.

У Ліны Одэны выявіліся якасці добрага камандзіра. Яна наладжвала сувязь з маракамі крэйсера „Лібертад", з лётчыкамі, якія павінны былі падтрымаць аперацыі дружыннікаў, рыхтаваўшыхся да штурму захвачанай фашыстамі Грэнады.

Нехапала зброі, боепрыпасаў.

Ліна не ведала спакою. Гарматы! Некалькі гармат і вопытных артылерыстаў! Гэтая думка цалкам аўладала ёю. Без гармат народная армія можа загінуць, не гледзячы на яе гераізм.

Ліна адправілася за дапамогаю да таварышоў у Барселону.

У Валенсіі яна купіла нумар „Хувентуд"—газеты Аб'яднанай соцыялістычнай моладзі. Яна разгарнула газету. Погляд яе спынілі чорная рамка і дарагое імя: „Гібель лейтэнанта дэ-Аро".

Яна закрыла твар рукамі. Сэрца сціснулася...

— Андрэс...—шаптала яна,—Андрэс, мой Андрэс...

Узяўшы сябе ў рукі, прачытала фатальную вестку:

„З прычыны перавагі сіл непрыяцельскай авіяцыі адважны лётчык, лейтэнант таварыш дэ-Аро, загінуў у паветраным баі геройскай смерцю"...

Ліна бачыла свет, як скрозь густую вуаль, Андрэс памёр... Яе Андрэс...

Потым ёй прышлі на памяць словы, якія сказаў дэ-Аро ў часе прагулкі па каталонскіх гарах: „Жыццё будзе прыгожым і для нас з табой таксама, Ліна..."

Вечарам яна напісала таварышам у Мадрыд:

„...Я-б схлусіла, не сказаўшы, што ў мяне на душы цяжка".

Потым яна расказала аб падзеях на грэнадскім фронце, паведаміла аб усім важным. Яна старалася захоўваць яснасць у галаве, вызваліцца ад асабістага гора.

„Андрэс памёр! Мой лётчык... Але засталіся тысячы байцоў. Засталіся мы, і мы здолеем адпомсціць за іх і трымацца да канца.

Я ведаю, што час—цяжкі, але я ўпэўнена, абсалютна ўпэўнена, што мы праб'емся.

... Спадзяюся адпомсціць за ўсіх нашых прыяцеляў, за ўсіх нашых таварышоў, за лепшую частку нашай моладзі, якая ідзе на смерць", закончыла яна.

На другі дзень Ліна была ў Барселоне.

Адтуль з атрадам артылерыі і двума гарматамі яна вярнулася ў Гуадыс, на фронт, на свой фронт, як яна яго называла.

У штабе Ліна Одэна доўга разглядала план ваенных аперацый. Потым яна накіравалася да дзвярэй.

— Куды ты, Ліна?

— Я хачу перад атакай яшчэ раз аб'ехаць лініі...

Яна села ў машыну.

Выехаўшы на поўразбуранае шасе, яны патушылі фары. Зігзагамі беглі па палях пазіцыі праціўніка. Перадавыя пасты фашыстаў былі ад іх у некалькіх стах метрах.

З цемры вынырнула постаць.

— Хто тут?—спытала Ліна.

— Цэнтурыя сержанта Гонсалес!—быў адказ. І потым зусім шэптам:—Сцеражыцеся, кампаньерас, у дзесяці метрах адгэтуль дарога развернута снарадамі і праехаць нельга.

— Далей нельга ехаць?—пацікавілася Ліна.

Голас у цемры адказаў:

— Не, можна, па старай дарозе, якая ідзе адгэтуль на лева...

Ліна задумалася на долю секунды.

— Паедзем!—вырашыла яна.

Машына ірванулася. Дарога была выбоістая.

— Стой!—прагучэла спераду.

Ліна хапілася за рэвальвер.

— Назад!—крыкнула яна шоферу. Той павярнуў машыну, націснуў на руль.

Грымнулі стрэлы.

Ззаду падбегла некалькі чалавек. Бліснуў ліхтар.

Па галаўных уборах Ліна пазнала мяцежнікаў.

„Той быў зусім не з цэнтурыі Гонсалеса,—падумала яна.—Гэта была пастка".

Яна выстраліла. Потым яшчэ раз, ведаючы, што патроны трэба берагчы.

— Паспрабуй выратавацца!—шапнула яна шоферу.—На поўны газ, наперад!

Адказу не было. Шофер паваліўся назад з прастрэленай галавой.

Ліна зноў выстраліла. „Яны не павінны захапіць мяне жывую!"—мільганула ў яе ў галаве. Яна ўсё страляла. У рэвальверы засталася апошняя куля. Яна гэта ведала.

Ля крыла машыны з'явіўся чалавек, пацягнуўся да яе.

У галаве пранёсся ўспамін аб таварышах у штабе...

Ліна націснула курок.

У грубыя рукі наёмніка павалілася мёртвае цела.

Вораг радаваўся. Як ваенную здабычу ўрачыста правезлі фашысты па вуліцах Грэнады цела забітай рэволюцыянеркі.

Байцы народнай міліцыі, маракі „Лібертад", лётчыкі сціскалі кулакі. Атрад народнай міліцыі імя Ліны Одэна, паранены ў самае сэрца, атакаваў ворага, гатовы памерці, але рушыцца наперад.

Люты быў бой—той бой, які падрыхтавала сама Ліна Одэна.

Шаснаццаць забітых і сто параненых фашыстаў засталіся ляжаць на полі бою. Рэспубліканцы захвацілі дзве гарматы. Гэта была перамога, атрыманая ўжо мёртвай Лінай.

Пасля бітвы байцы напісалі на сваіх сцягах:

„Клянемся табе, Ліна, поўнасцю вызваліць Іспанію ад фашысцкай чумы!

МАЛАДАЯ МАЦІ

Ніжэй мы друкуем першы расказ рабкоркі нашага журнала Юлі Васільеўны Баравіковай

На двары працягла і злосна завываў халодны асенні вецер. Ён то сціхаў, то раптам з патроенай сілай налятаў на ўсё, што сустракалася на яго шляху.

Дрэвы жалобна скрыпелі і пакачваліся ў такт ветру, густа асыпаючы зямлю жоўтымі лісцямі. Вецер надхопліваў іх, шалёна круціў у паветры і бязлітасна кідаў у халодную, ліпкую гразь.

Чорныя цяжкія хмары зацягнулі ўсё неба.

Буйныя кроплі дажджу з шумам апускаліся на будоўлі, дрэвы, траву і дарогу, сгвараючы велізарныя лужы. Дождж біў у невялікае вакенца пакоя, у якім спалі Аня з маленькай сястрой Тамарай.

У хаце панавала цішыня, якая зрэдку парушалася храпам бацькі. У гэтай цішыні асабліва злоснымі былі стук дажджу і завыванне ветра. Ані не спалася...

Яна варочалася з боку на бок на сваім ложку, некалькі разоў садзілася, хутаючыся ў коўдру і падабраўшы пад сабе ногі, да чагосьці прыслухоўвалася. Гэта „штосьці" было яшчэ ледзь адчувальным.

— Вось зноў, зноў,—шаптала Аня і замірала ў чаканні слабых штуршкоў дзесьці ў сярэдзіне.

Не вытрымаўшы гнятучай цемры, стука дажджу і дакучлівага гудзення ветру, Аня ўстала і запаліла лямпу. Яна мільком зірнула на сябе ў люстра.

— Не, я зусім не змянілася,— супакойвала яна сябе.—Няўжо гэта праўда?

Зноў падышла да люстра, з якога выглянула прыгожая белакурая галоўка з вялікімі блакітнымі вачыма.

Прысеўшы на ложак і выціраючы слёзы, Аня перабірала ў сваёй памяці здарэнні апошніх месяцаў.

— Хіба я вінавата, што так здарылася? Шчаслівая вось Тамара, ні аб чым яна не думае, а ў мяне вось гісторыя...

Ані ледзь мінула дзевятнаццаць год. Заўсёды вясёлая і жыццерадасная, яна была любіміцай ў сям'і і на фабрыцы. Ніводнай масоўкі не праходзіла без Ані.

— Аннушка, давай арганізуем гульні!—клікалі яе з аднаго боку.

— Анечка, пойдзем танцаваць!—чулася з другога боку.

— Аня, давай заспяваем!

Квяцістае плацце Ані мільгае то тут, то там, хаваючыся ад даганяючага „ката". Неўзабаве Аня насілася ў віхры вальса. А пазней яе можна было бачыць у натоўпе спяваючых хорам. І яе звонкі голас запяваў:

Широка страна моя родная,
Много в ней лесов, полей и рек.
Я другой такой страны не знаю,
Где так вольно дышит человек...

Аня пазнаёмілася з Сашам. Высокі, стройны, прыгожы, ён зачараваў Аню. Знаёмства хутка перайшло ў гарачае каханне.

Частыя сустрэчы, мары аб будучым адцягнулі ўвагу Ані ад сапраўднасці. Месяцы ішлі хутка... Аня нават не заўважыла ахаладжэння Сашы. Апамятавалася яна толькі тады, калі адчула, што цяжарная.

Разам з трывогай, Аню ахапіла вялікая радасць.

— У мяне будзе сын,—думала яна, стоячы ля станка, які здавалася таксама падпяваў: „сын, сын, сын".

— Ён будзе прыгожым, чарнявым, з вялікімі вачыма. Назаву я яго абавязкова Вовай. Прыду з работы, а ён будзе ручонкі працягваць і шчабятаць: „мама, мама". А як мы будзем свайго сынішку кахаць! Якіх цацак накупім яму!

Аня ледзь дачакалася канца сваёй змены і, не заходзячы дадому, пабегла да Сашы, каб падзяліцца з ім сваёй радасцю.

Прыход Ані ўстрывожыў Сашу. Ён дапытліва глядзеў на яе твар. Здагадка мільганула ў яго галаве. Настрой адразу змяніўся. Ён інакш думаў правесці сённешні вечар, і таму непрыязна зірнуў на ўвайшоўшую Аню. З іранічнай усмешкай Саша запытаўся:

— Чаго цябе прынесла ў такую рань? Ці не перасяляцца ты да мяне сабралася?

Аня не заўважала перамены ў настроі Сашы. Наіўна чырванеючы, яна паспешліва расказвала аб сваёй радасці, аб сваіх марах на будучае.

— Сашанька, сын-жа ў нас будзе!—паўтарала некалькі разоў шчаслівая Аня.

Але, калі зірнула на таго, к каму прышла падзяліцца сваёй радасцю, убачыла зусім чужога і далёкага ёй чалавека. На яе глядзеў злосны і халодны твар. Як у тумане яна памятае едкія, як біч, словы Сашы, хутчэй абрыўкі зблытаных слоў.

— Дзіцё не маё. Я не маю намеру лічыцца бацькам чужога дзіцяці, зразумела?

Аня ўстала і хістаючыся, накіравалася да дзвярэй. Уздагон ён неслася: „І наогул я ніколі не збіраўся звязвацца з табой. Ты-ж з усімі гуляла".

Як пасля цяжкай хваробы ішла Аня дадому. Галава кружылася, ногі падкашваліся, а з памяці не выходзілі жудасныя словы: „дзіцё не маё".

Пацягнуліся дні перажыванняў. Сказаць каму-небудзь аб нанесенай крыўдзе Аня не адважвалася. Маўчаць, таіць у сябе было невыносна. Сашу яна ўзненавідзела. Толькі цяпер яна зразумела ўсю агіднасць яго паводзін.

Але доўга маўчаць яна не магла. Неўзабаве Аня расказала аб здарыўшымся падругам. Падругі, такія-ж, як і Аня, маладыя дзяўчаты, падбадзёрылі яе. Аня паступова пачала рыхтавацца да сустрэчы дзіцяці. Кожную палучку адкладвала частку грошай і ўносіла ў ашчадкасу. Дні ішлі... Аня ўжо звыклася з думкай, што ў яе будзе дзіцё. Сёння нешта новае дало адчуваць аб гэтым.

Усю ноч праседзела яна на ложку і яшчэ і яшчэ раз абмяркоўвала сваё становішча. Толькі раніцой заснула яна, з цвёрдай думкай пайсці заўтра і расказаць усё Веры Нікалаеўне, старшыні фабкома.

Перад пачаткам работы Аня з замiраннем сэрца зайшла ў фабком. Нерашуча спынілася каля дзвярэй.

— Ісці або не?

Тут-жа ўявіла сабе пажылую, добрую жанчыну, якая чула адносілася да работніц. Адчыніла дзверы. За сталом сядзела Вера Нікалаеўна і нешта пісала. Пачуўшы скрып дзверы, яна падняла галаву і ласкава зірнула на ўвайшоўшую.

— Ну, што скажаш? Па твару бачна, што нешта хвалюе цябе. Сядай, сядай і раскажы ў чым справа.

Цеплыня гэтых простых слоў

растрывожылі Аню. Яна заплакала. Праз некаторы час, усхліпваючы, расказвала аб сваіх перажываннях, аб сваіх сумненнях. Вера Нікалаеўна ўважліва слухала і ківала галавой.

— Хіба можна так думаць? Хіба ў нашай краіне можна прапасці? У нас, дзе такой увагай акружаны людзі, і асабліва маці і яе дзеці. Будзь спакойнай, яшчэ якога сына выхаваем! Прымусім і бацьку плаціць на выхаванне дзіцяці,—гаварыла Вера Нікалаеўна.

З фабкома Аня вышла зусім заспакоенай. Сумненні рассеяліся як дым. Яна больш не адчувала сябе адзінокай і ведала, што калектыў дапаможа ёй. Аня зажыла спакойнымі і поўнымі чакання днямі.

Вера Нікалаеўна, як абяцала, пабывала ў яе бацькоў. Асцярожна расказала ім аб здарыўшымся. Маці нават пакрыўдзілася, што дачка не сказала ёй сама.

— Маці роднай не гаварыла, а пайшла да чужых,—доўга журыла яна Аню.

Час ішоў... Аня атрымала дэкрэтыўны адпачынак. Аднойчы позна ўначы яна адчула невядомы дагэтуль боль, які пачаў ахопліваць ўвесь арганізм. Аня з цяжкасцю ўстрымлівалася, каб не закрычаць і не разбудзіць сястру.

„Пачынаюцца схваткі", падумала Аня, і паспрабавала ўстаць і пайсці да маці, але новы прыступ прымусіў яе застацца і голасна застагнаць. Гэта пачула Тамара. Яна хутка ўстала і пабегла да маці, і неўзабаве пачуўся яе ўсхваляваны шэпт:

— Мама, уставай хутчэй...

Маці, спяшаючыся, увайшла ў пакой. Зараз-жа Аню павезлі ў больніцу. А праз тры гадзіны ў яе нарадзіўся дзевяціфунтовы сын.

Калі прынеслі карміць сына, шчасцю Ані не было граніц.

— Сынок, радасць мая ненаглядная!—шаптала маладая маці, забываючы аб перанесеным болю. Яна нежна прыціскала да сябе малютку, цалавала яго ў шчочкі, лобік і вялікія вочкі.

— Ты лётчыкам будзеш, інжынерам, вучоным—усім, кім пажадаеш, праўда? Нічога пражывем з табой і без бацькі. У нашай краіне няма сірот.

— Грыгорьевай Ані перадача,— пачула яна голас санітаркі.

Санітарка паставіла на яе столік велізарны торт, на якім было напісана: „Маладой маці ад калектыва фабрыкі". Тут-жа было пісьмо ад Веры Нікалаеўны, якая вітала яе з нараджэннем сына.

Аня была ўсхвалявана да слёз.

— Вовачка, сыночак родненькі, шчаслівыя мы з табой,—шаптала яна.—Добра, што ў нас такая прыгожая радзіма, у ёй мы ніколі не прападзем. Я хутка зноў вярнуся да станка, а цябе ў яслі насіць буду.

А сыночак, салодка пасапваючы і прычмокваючы, спакойна спаў.

Аня штодзённа атрымоўвала з фабрыкі цёплыя таварыскія пісьмы. А як толькі прыехала дадому, яе адразу-ж наведалі падругі і Вера Нікалаеўна. Яны расказвалі ёй аб фабрычных навінах, перадавалі віншаванні ад таварышоў па цэху. Бацькі ў гэты час даглядалі ўнука, клапатліва глядзелі і дачку. Жыццё ўвайшло ў нармальную каляю.

Ю. Баравікова.

АБ ПАРАДКУ ВЫДАЧЫ ДЗЯРЖАЎНЫХ ДАПАМОГ МНОГАДЗЕТНЫМ МАЦЕРАМ

Соўнарком СССР зацвердзіў распрацаваную Наркамздравам СССР падрабязную інструкцыю аб парадку прызначэння і выдачы дзяржаўных дапамог многадзетным мацерам.

Дзяржаўная дапамога выдаецца кожнай маці, маючай не менш 7 дзяцей, з якіх малодшаму менш пяці год. Пры прызначэнні дапамогі ўлічваюцца ўсе дзеці данай маці (ад аднаго ці розных бацькоў), незалежна ад узросту і ад таго, ці жывуць яны з маці ці асобна ад яе. У разлік не прымаюцца памёршыя дзеці, а таксама пасынкі, падчарыцы, усыноўленыя і дзеці, якія з'яўляюцца іншаземнымі падданымі.

Дапамога на дзіцё да дасягнення ім пяцігадовага ўзросту выплачваецца маці кожны год. Пры прызначэнні дапамогі на дзяцей, якія нарадзіліся да апублікавання пастановы ЦВК і Соўнаркома СССР, год лічыцца з 27 чэрвеня 1936 года, г. зн. даты зацвярджання гэтай пастановы. Пры прызначэнні дапамогі на дзяцей, якія нарадзіліся пасля апублікавання пастановы, год лічыцца з дня нараджэння дзіцяці.

У выпадку смерці дзіцяці, на якога прызначана дапамога, ці смерці каго-небудзь з іншых дзяцей данай сям'і, калі ў жывых у сям'і застаецца менш сямі дзяцей, выплата дзяржаўнай дапамогі спыняецца. Пасля смерці маці дзяржаўная дапамога выдаецца, як адначасовая, бацькі ці асобам, на ўтрыманні якіх знаходзяцца дзеці, толькі ў тым выпадку, калі гэта дапамога была прызначана яшчэ пры жыцці маці. Далейшая выдача дапамогі спыняецца. Незапатрабаваная на працягу года чарговая дапамога выдачы не падлягае.

Інструкцыя падрабязна вызначае парадак прызначэння дзяржаўных дапамог. Да заявы, падаемай маці ў раённыя або гарадскія бюро запісаў актаў грамадзянскага стану (ЗАГС), прыкладаецца пасведчанне аб нараджэнні кожнага з дзяцей і ў гарадах—даведка, выдадзеная міліцыяй, а ў сельскіх мясцовасцях—пратакол прэзідыума сельсавета аб ліку дзяцей, пражываючых пры данай мацеры, і аб іх узросце. Заявы і даведкі правяраюцца бюро ЗАГС і ўносяцца з усім матэрыялам на рашэнне райвыканкома ці горсавета. Райвыканкомы на свае паседжанні выклікаюць старшынь адпаведных сельсоветаў.

Рашэнне райвыканкома ці горсавета накіроўваюцца на канчатковае зацвярджанне краявога ці абласнога выканкома, а ў рэспубліках, не маючых абласнога дзялення,—на зацвярджанне Соўнаркома.

На аснове рашэння аб выдачы дапамогі мацеры выдаецца на кожнае дзіця спецыяльная асабістая кніжка на права атрымання дапамогі. Пры атрыманні дапамогі за другі і наступныя гады жыцця дзіцяці ўладальніца кніжкі зноў прадстаўляе ў бюро ЗАГС даведкі аб наяўнасці ў жывых усіх яе дзяцей, прынятых у разлік пры прызначэнні дапамогі.

Разгляд і канчатковае рашэнне справы аб прызначэнні дапамогі павінна заканчвацца не больш, чым у 3 месячны тэрмін.

Дзяржаўныя дапамогі выдаюцца многадзетным мацерам гарадскім ці раённым фінансавым аддзелам па месцу іх жыхарства па прад'яўленні кніжкі. Дапамога выплачваецца кожны раз у поўнай гадавой суме.

Кантроль за выкананнем інструкцыі ўскладаецца на Наркамздраў СССР і яго органы на месцах.

(„Правда")

Цана 20 кап.

1964 г.

053

Да гэтага нумара дадаецца ўкладка-выкрайка.



В. С. Маладцова – работніца фабрыкі-кухні без адрыва ад вытворчасці стала вучлётам.
(ЬСФ)

Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 889. Тыраж 7.427 экз. Галоўлітбел № 2196.
Здана ў набор 15/VI—37 г. Падпісана да друку 28/VI—37 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.